M/Б

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР
ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАВЕДНІК

МІНСК, 1961.



НС

ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІЯТЭКА БССР
ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

*Аддзел беларускай літаратуры і бібліяграфіі*

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

**ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ**

**БІБЛІЯГРАФІЧНЫ ДАВЕДНІК**

ине. 807

МІНСК, 1961.

Склала *Н. Ватацы.*

*«Мы павінны сабраць і выпусціць у свет усю літаратурную спадчыну Максіма Багдановіча, каб на ёй раслі і гадаваліся нашыя маладыя кадры літаратараў».*

Якуб Колас[1])

---

[1] Я. Колас. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, ДВБ, 1957, с. 242.

*«Прывет табе, жыццё на волі!»*
*М. Багдановіч* [1]

# ПРАДМОВА

Літаратурная спадчына М. Багдановіча займае выдатнае месца ў развіцці беларускай літаратуры. Дзейнасць паэта прыпадае на апошняе перадкастрычніцкае дзесяцігоддзе (1907—1917 гг.).

Паэт бліскучага таленту, М. Багдановіч пакінуў нам класічныя ўзоры грамадзянскай, філасофскай, інтымнай і пейзажнай лірыкі, эпічных твораў, напісаных па народных матывах, наследванняў песням розных народаў. Максім Багдановіч узбагаціў беларускую літаратуру мастацкімі перакладамі на родную мову асобных вершаў Пушкіна, Гарацыя, Авідзія, Шылера, Гейнэ і інш. Выхаваны на лепшых узорах класічнай рускай і сусветнай літаратуры, М. Багдановіч развіваў у беларускай літаратуры прынцыпы рэалізму і народнасці.

Высокаадукаваны паэт М. Багдановіч быў таксама таленавітым публіцыстам і літаратурным крытыкам.

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 34.

Змест дадзенага бібліяграфічнага даведніка складаюць наступныя матэрыялы: бібліяграфічны агляд асноўных твораў М. Багдановіча; спіс яго кніг у арыгінале і ў перакладзе на рускую і украінскую мовы; бібліяграфія твораў, якія не ўвайшлі ў выданні паэта; спіс твораў М. Багдановіча, пакладзеных на музыку; кароткая бібліяграфія біяграфічнай і крытычнай літаратуры, прысвечанай М. Багдановічу.

. Задача даведніка — дапамагчы бібліятэкару, лектару, настаўніку і студэнту філалагічнага факультэта ў вывучэнні і прапагандзе сярод шырокіх колаў чытачоў багатай літаратурнай спадчыны Максіма Багдановіча.




Вокладка кнігі М. Багдановіча «Вянок» (Вільна, 1913).

*Ты не згаснеш, ясная заранaчка,*
*Ты яшчэ асвеціш родны край.*
*Беларусь мая! Краіна-бранaчка!*
*Устань, свабодны шлях сабе шукай.*
*М. Багдановіч*[1]

# МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

(1891 — 1917)

## Біябібліяграфічная даведка

Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся 9 снежня (27 лістапада ст. ст.) 1891 г. у горадзе Мінску ў сям'і настаўніка і этнографа. Дзяцінства яго прайшло ў Гродна і Ніжнім Ноўгарадзе, юнацкія гады — у Яраслаўлі. У Ніжнім Ноўгарадзе сям'я Багдановіча зблізілася з сям'ёй Аляксея Максімавіча Горкага. Аляксей Максімавіч лічыў бацьку беларускага паэта сваім блізкім сябрам.

Максім Багдановіч выхоўваўся ў культурнай сям'і, Адам Ягоравіч прывіваў сваім дзецям любоў да літаратуры і, асабліва, да народнай творчасці. Паэт скончыў гімназію і Яраслаўскі юрыдычны ліцэй.

Будучы вучнем Ніжагародскай гімназіі, Максім Багдановіч у 1907 годзе публікуе пер-

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с 393.

шы свой твор — апавяданне «Музыка» ў беларускай газеце «Наша ніва» (1907, № 24, 6 ліп.).

Самая інтэнсіўная творчая дзейнасць паэта падае на ліцэйскі перыяд яго жыцця. У 1913 годзе ў Вільнюсе выйшла адзіная прыжыццёвая кніжка вершаў маладога паэта «Вянок», а ў 1914 годзе ў Маскве — некалькі папулярных яго брашур аб славянскіх народах на рускай мове. Максім Багдановіч змяшчаў свае паэтычныя, празаічныя, літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя творы ў рускім, беларускім і украінскім перыядычным друку.

Скончыўшы ліцэй, М. Багдановіч едзе ў 1916 годзе ў Мінск і працуе ў губернскім харчовым камітэце. Цяжкая хвароба прымушае яго ў пачатку 1917 года выехаць у Ялту. Тут, з прычыны туберкулёзу лёгкіх, ён памёр на 26-м годзе жыцця 25 мая 1917 года.

Большасць твораў Максіма Багдановіча выдадзена пасмяротна. У 1927 — 1928 гг. выйшла ў свет двухтомнае акадэмічнае выданне, у якое ўвайшлі як мастацкія, так і публіцыстычныя творы. У 1940, 1946 і 1952 гадах выйшлі кнігі выбраных твораў, у 1957 годзе— акадэмічнае выданне мастацкіх твораў паэта.

У перакладзе на рускую мову мастацкія творы Багдановіча выдаваліся ў 1940 і 1953 гадах. У 1929 годзе выйшла кніга выбраных яго твораў на украінскай мове.

* * *

Максім Багдановіч — паэт прадкастрычніцкага дзесяцігоддзя, ён выступіў у літаратуры ў 1907 годзе. Творчасць паэта займае

значнае месца ў беларускай літаратуры. Паэзія яго была цесна звязана з народнай творчасцю, была блізкай да грамадзянскай паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Творчасць Максіма Багдановіча разнастайная: ён пісаў лірычныя вершы, паэмы («Страцім-лебедзь», «Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык», «Вераніка», «Максім і Магдалена», «Вёска») і апавяданні («Музыка», «Мадонна», «Апавяданне аб іконніку і залатару», «Апокрыф», «Шаман» і інш.). Таленавіты паэт і празаік Максім Багдановіч выступаў і ў якасці літаратурнага крытыка і публіцыста. Шырока вядомы яго літаратурна-крытычныя артыкулы «Глыбы і слаі» (1911, прысвечаны разгляду сучаснай яму беларускай літаратуры), «Краса и сила» і «Памяти Т. Г. Шевченко» (1914, аб творчасці вялікага украінскага песняра), «Забыты шлях» (1915, аб значэнні народнай творчасці ў плённым развіцці роднай літаратуры) і інш., а таксама публіцыстыка паэта («Новая интеллигенция», 1914, і інш.) і папулярныя брашуры аб жыцці славянскіх народаў (Червонная Русь. М., 1914; Угорская Русь. М., 1914; Братья чехи. М., 1914; Белорусское возрождение. М., 1916).

Паэт беражліва адносіўся да паэтычнай спадчыны беларускага, рускага і іншых народаў і любоўна вывучаў яе. Значнае месца ў творчасці Багдановіча займаюць яго пераклады рускай, украінскай і зарубежнай паэзіі як на беларускую, так і на рускую мовы. Ён перакладаў на беларускую мову творы Пушкіна, Шаўчэнкі, Авідзія, Гарацыя, Шылера, Гейнэ, Верхарна і інш. Паэт вывучаў народную

творчасць розных народаў і напісаў цыкл вершаў па матывах рускіх, украінскіх, сербскіх, скандынаўскіх, іспанскіх, персідскіх і японскіх песень.

Дамінуючай тэмай паэтычнай творчасці Багдановіча з'яўляюцца думы аўтара аб лёсе беларускага народа. Ужо ў першым сваім друкаваным творы — вершы ў прозе **«Музыка»** (1907) — Максім Багдановіч выказаў думку аб тым, што мастацтва павінна выказваць спадзяванні і мары народа, узнімаць яго на барацьбу. У вершах **«Краю мой родны!..»** (1909), **«З песняў беларускага мужыка»** (1909), **«Пан і мужык»** (1912) і інш. паэт малюе цяжкае жыццё простага народа ва ўмовах царскай Расіі. Праўдзіва маляваў паэт жабрацтва і прыгнечанасць сялянства ў дарэвалюцыйнай беларускай вёсцы.

Поруч раскінулісь родныя вёскі.
Жалем сціскаюцца грудзі! —
Бедныя хаткі, таполі, бярозкі,
Усюды панурыя людзі...
. . . . . . . . . . . .
Сціснула гора дыханне ў народзе,
Гора усюды пануе [1].
(«Краю мой родны», 1909).

М. Багдановіч паказаў у сваёй творчасці рост палітычнай свядомасці працоўнага сялянства ў выніку рэвалюцыі 1905 — 1907 гадоў. Селянін у творах паэта ўжо не можа слепа падпарадкоўвацца панам і царскім чыноўнікам, бо добра разумее, што прывілегіяваныя класы прысвойваюць яго працу. У вершы

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 84.

«Пан і мужык» з цыкла «Усмешкі» ён адкрыта заяўляе аб гэтым:

Дзякуй, пане, бо пазнаў ад вас і я, —
Не на трох кітах трымаецца зямля.
Згода, згода, бо здаецца неяк мне,
Што стаіць яна на нашай-жа спіне [1].

Адным з лепшых узораў сацыяльна-палітычнай лірыкі паэта з'яўляецца яго верш «Мяжы» (1914). Паэт выступае ў ім ад імя «галоднага і абдзёртага люду», «каторы моцнымі рукамі стварыў усе багацтвы на зямлі»; ад імя рабочых, якія пралажылі шлях чыгунцы, высока паднялі ў неба коміны заводаў; ад імя сялян, пакрыўшых нівамі бязмежныя раўніны. Гнеўна асуджае Багдановіч капіталістычную эксплуатацыю і прыватную ўласнасць.

Глядзі: па ўсёй зямлі святой
Шырокай хваляй залатой
Без краю блішча збожжа мора,
Цвітуць лугі, шумяць лясы...
Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе і зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь — мяжы, бо скрозь — платы [2].

Шмат у якіх вершах (**«Дождж у полі і холад... Імгла...», «Рушымся, брацця, хутчэй...», «Халоднай ноччу я ў шырокім цёмным полі...», «Зразаюць галіны таполі адну за адной»** і інш.) Максім Багдановіч горача заве народ на барацьбу за лепшае жыццё, за сваю свабоду і незалежнасць. Паэт шчыра верыць у волю і моц народа, у вершах яго адчуваецца

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 199.
[2] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 226.

набліжэнне рэвалюцыйнай буры. У вершы **«Не бядуй, што хмары...»** паэт кажа:

Не бядуй, што хмары
Сонца свет схавалі.
Нарадзіцца мусіць
Бура з гэтых хмар.
Праўда, усё прыціхла...
Бор замоўк і хвалі,
Але будзе бура,
Тым мацней удар! [1].

У вершы **«Кінь вечны плач свой аб старонцы...»** тая самая думка аб блізкасці рэвалюцыі ўвасабляецца ў другіх вобразах. «Кінь вечны плач свой аб старонцы! — кажа паэт, — няўжо жа цёмнай ноччу ты не бачыш, што глядзіцца сонца ў люстэрка — месяц залаты?»[2]. Максім Багдановіч заклікае працоўны народ да суровай барацьбы за свае правы:

Рушымся, браццця, хутчэй
У бой з жыццём, пакідаючы жах,
Крыкі пужлівых людзей
Не стрымаюць хай бітвы размах... [3].
(«Рушымся, браццця, хутчэй», 1910 г.)

Паэт разумее, што барацьба гэта будзе цяжкай, і заклікае народ да мужнасці і стойкасці ў барацьбе.

Не хіліцца з бяды, не пужацца агня
Бо мы толькі тады дачакаемся дня,
Калі нас не здалее змаганне злякаць [4].
(«Нашых дзедаў душылі абшары лясоў...»,
1909—1912 г.г.)

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 196.
[2] М. Багдановіч. Творы Мінск, АН БССР, 1957, с. 86.
[3] Там жа, с. 88.
[4] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 89.

Творчасць Максіма Багдановіча глыбока аптымістычная, ён ні на мінуту не сумняваецца ў тым, што настане ясны, сонечны дзень для працоўнага беларускага народа:

Не згасла сонца! Сонца гляне,
Усіх падыме ада сна.
Ён, гэты дзень, яшчэ настане, —
І ачуняе старана!
Я пад яе зімовай маскай —
Пад снегам — бачу твар вясны,
І вее верш мой дзіўнай казкай,
І ясны ён, як зорак сны [1].

(«Кінь вечны плач свой аб старонцы», 1911 г.)

А ў 1915 годзе Максім Багдановіч пісаў:

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгараецца,
Сколькі ў хмарах залётных агня... [2].

(«Беларусь, твой народ дачакаецца»).

Шырока вядомы верш М. Багдановіча **«Слуцкія ткачыхі»** (1912) аб прыгонных беларускіх дзяўчатах-ткачыхах, якія сваімі ўмелымі рукамі стваралі раскошныя залатыя і сярэбраныя паясы для магнатаў. Адарваныя ад роднай сям'і, марачы аб вольным жыцці на родных прасторах, яны ўвасаблялі свае мары ў рысунках на тканіне:

І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора
Цвяток радзімы васілька [3].

Бадай упершыню ў беларускай літаратуры Максім Багдановіч стварае ў 1911—1912 г.г.

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 86.
[2] Там-жа, с. 393.
[3] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 393.

паэтычныя творы на тэму сучаснага яму горада. Прыгадаем такія вершы, як **«Уступ», «Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!», «У Вільні», «За дахамі места памеркла нябёс пазалота...», «На глухіх вулках — ноч глухая», «Завіруха», «Сеў хлопчык з шклянкай ля вулічнага ганку», «Ад спекі пышуць дахі і асфальт», «Дзве смерці»**, якія ўвайшлі ў цыкл вершаў «Места». Гэта вершы аб душных і пыльных кварталах, дзе «заводаў коміны пад цьмой нябёс», дзе «кіпіць натоўп на жорсткім вулак дне»[1] і ў людзей «...гарацць аганьком вочы змучаных твараў!»[2].

У лірычных вершах Максіма Багдановіча з хвалюючай шчырасцю раскрыты асабістыя перажыванні паэта. Вершы паэта прысвечаны дружбе і каханню, малююць паэтычныя карціны прыроды. У іх часта гучаць напевы народных песень, родныя галасы мілай сэрцу паэта Беларусі (**«Белым кветам адзета каліна», «Сумна мне...»** і інш.)

Сумна мне, а ў сэрцы смутак ціха запявае:
«Сцежка ў полі пралягае, траўкай зарастае.
Каля сцежкі пахіліўся явар да каліны —
Там кахаліся калісь-то хлопец і дзяўчына».

(«Сумна мне, а ў сэрцы смутак
ціха запявае...», 1911 г.) [3].

Добра ведаючы і аддчуваючы беларускую народную паэзію, Максім Багдановіч часта ўводзіў народныя матывы і сюжэты ў сваю творчасць. Так, напрыклад, у 1914 — 1915 га-

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 72 (верш «У Вільні»).

[2] Там-жа, с. 71 (верш «Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць»).

[3] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР, 1957, с. 55.

дах ён напісаў некалькі вершаў па матывах рэкруцкіх песень, у якіх асуджаў імперыялістычную вайну, якая прыносіць пакуты народу (**«Цёмнай ноччу лучына дагарала...», «Ой грымі, грымі, труба, уранку рана», «Ты доўга сядзела за сталом...»** і інш.). У 1915 годзе ён напісаў па матывах беларускіх народных песень гумарыстычную паэму аб прыгодах камара і мухі **«Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык».** Паэма напісана з вялікім майстэрствам і веданнем народных звычаяў, абрадаў і складу народнай песні.

Фабула народнай казкі на біблейскую тэму пра птушку Страціма лягла ў аснову паэмы Багдановіча **«Страцім-Лебедзь»** (1916). Казачна-біблейскі сюжэт прымае пад пяром паэта сацыяльную афарбоўку, і благародны і мужны Лебедзь Багдановіча нагадвае горкаўскага Сокала. Па распаўсюджаных матывах беларускай народнай творчасці напісана і паэма пра нешчаслівую любоў селяніна Максіма да дачкі ваяводы (**«Максім і Магдалена»**, 1915 г.).

У Багдановіча многа вершаў аб прыродзе, поўных любві да роднага краю, сцвярджаючых хараство прыроды і чалавека (**«Здароў марозны, звонкі вечар», «Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог...», «Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы...», «Прывет табе, жыццё на волі!», «Вечар на захадзе ў попеле тушыць...», «Ціха па мяккай траве сінявокая ноч прахадзіла...»** і інш.).

Малюючы паэтычныя карціны беларускай прыроды, М. Багдановіч ажыўляе іх вобразамі народнай міфалогіі. У глухой пушчы жыве лясун (**«Прывольная цёмная пушча...», «Сос-**

**ны, елі, хвоя, хвошчы»**, **«Я спакойна драмлю пад гарой між кустоў»)**; з цесных, душных падзямельных норак выпаўзае таямнічы змяіны цар (**«Змяіны цар»**); у віхры мяцеліцы круціцца па палях буйны Падвей:

> Пляша, скача. Снег зрываецца, ляціць.
> Веюць у полі снегавыя рукава,
> А Падвей нясецца, кружыцца, гудзіць,
> Запявае, удалая галава!
>
> («Падвей») [1].

Цікавы таксама вершы, сабраныя аўтарам у цыкле «К а х а н н е  і  с м е р ц ь», якія з'яўляюцца своеасаблівым гімнам жанчыне-мацеры. Да гэтага цыклу прымыкаюць вершы **«Тым вянкі суворай славы...»**, **«Ціха ідзеш ты...»**, **«Вечар ціхі, вечар просты»** і інш.

У вершах **«Ліст...»**, **«У вёсцы»**, **«Мае песні»**, **«Ой, чаму я стаў паэтам»**, **«Песняру»**, **«Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя»**, у апавяданнях **«Музыка»**, **«Мадонна»**, **«Апавяданне аб іконніку і залатару»** і інш. Максім Багдановіч выказаў свае погляды на ролю мастацтва. І ў сваіх вершах, і ў сваіх артыкулах М. Багдановіч рашуча выступаў супраць пропаведзі чыстага мастацтва. Вытокі мастацтва ён бачыў у рэальным жыцці і народнай творчасці, ён лічыў, што мастацтва павінна вучыць людзей і клікаць іх да лепшай будучыні, прымаць актыўны ўдзел у перабудове грамадскага жыцця.

Вершы Максіма Багдановіча адрозніваюцца шчырасцю і паэтычнасцю. Яны прасякнуты

---

[1] М. Багдановіч. Творы. Мінск, АН БССР. 1957, с. 169.

высокімі ідэямі сапраўднага гуманізма, на-роднасці і братэрства славянскіх народаў.

Паэт-лірык у пераважнасці, Багдановіч пі-саў невялікія, заўсёды закончаныя творы. Аў-тар умеў коратка і паэтычна выказаць сваё перажыванні і роздум, і ў сваіх паэтычных выказваннях адстойваў права на жыццё ма-лых паэтычных форм (гл. трыялет 1913 г **«Крытыку»**).

Многія вершы Багдановіча (**«Зорка Венера ўзышла над зямлёю...», «Маладыя гады» «Вечар», «Глянь, як зорка ў цемні ляціць...» «Зімой», «Набягае яно»** і інш.) натхнілі кам-пазітараў Беларусі на стварэнне музычных твораў. Рамансы на словы М. Багдановіча стварылі *Аладаў, Багатыроў, Туранкоў, Абе-ліовіч* і іншыя кампазітары.

## КНІГІ М. БАГДАНОВІЧА

### I. Прыжыццёвыя выданні

1. **Вянок.** Кніжка выбраных вершаў. Віль-а, друк. Марціна Кухты. 1913, 120 стар. з артр. (2000 экз. 50 к.).

Выданне 2-е: Вільна, 1927.

Адзіны прыжыццёвы зборнік паэтычных твораў М. Багдановіча змяшчае ў асноўным вершы 1909—912 г.г.[1] Кніга прысвечана памяці беларускага паэта ергея Палуяна. Складаецца яна з некалькіх тэматыч-а звязаных цыклаў вершаў.

М. Багдановіч дае ў сваёй кнізе таксама ўзоры пе-екладаў з украінскай паэзіі і пераклад некалькіх рад-оў з паэтычнай кнігі Авідзія «Метамарфозы».

З прычыны адсутнасці сродкаў, прыжыццёвая кніга ершаў паэта друкавалася доўга і фактычна ўбачыла ет у пачатку 1914 года. Аб цяжкасцях, з якімі выда-лася кніга, чытаем мы ў пісьмах Багдановіча.[2] За-валіся таксама цікавыя выказванні М. Багдановіча аб думе яго ўласнай паэтычнай кнігі.[3]

2. **Червонная Русь.** (Австрийские украин-ы) М., Книгоиздательство К. Ф. Некрасова, 14. 31 с. (Б-ка войны, № 8—9).

---

[1] Некаторыя вершы паэт дасылаў для зборніка ў ршай палове 1913 г., калі ўжо была карэктура пер-х аркушаў кнігі (гл. пісьмы М. Багдановіча, часоп. олымя», 1958, № 3, с. 178).

[2] Часоп. «Полымя», 1952, № 3, с. 180.

[3] Багдановіч М. Творы. Т. I. 1927, с. 450; часоп. олымя», 1958, № 3, с. 178; **Железняк Г.** Поэзия М. А. гдановича. Л., 1941, с. 205—206. (Дысертацыя).



Публіцыстычныя брашуры М. Багдановіча.

3. **Угорская Русь.** М., Книгоиздательст К. Ф. Некрасова, 1914. 16 с. (Б-ка войн № 24).

4. **Братья чехи.** М., Книгоиздательст К. Ф. Некрасова, 1914. 16 стр. (Б-ка войн № 28).

5. **Белорусское возрождение.** М., изд. жу «Украинская жизнь», 1916. 24 с. (отд. ( тиск из жур. «Украинская жизнь» № 1— 1915).

6. **Білоруске відродженнэ.** Київ, вид. Союза визволення України, 1916.

## II. Пасмяротныя выданні твораў М. Багдановіча

### *а) Зборы твораў*

7. **Творы М. Багдановіча.** Падрыхтавана літаратурнаю камісіяй Інбелкульту. Пад рэд. праф. *І. Замоціна.* Мінск, выд. Ін-та беларус. культуры, 1927—1928. 2.000 экз.

Т. I. Вершы. Апавяданні. (Тэкст—увагі—варыянты). XV, 502 с. з партр., з іл. 3 р.

Т. 2. Празаічныя творы. (Тэкст — увагі — дадаткі). (З уступ. артыкулам *І. Замоціна).* XC, 418 с. з партр. 2 р.

Першае савецкае выданне твораў М. Багдановіча, змяшчае ўсе мастацкія і публіцыстычныя творы паэта, якія былі вядомы ў той час.

У выданне ўвайшла кніга «Вянок» (1913), творы Багдановіча, змешчаныя ў перыядычным друку, а таксама творы, якія захаваліся ў аўтографах і былі перададзены Інстытуту беларускай культуры ў 1923 годзе бацькам паэта Адамам Ягоравічам і іншымі асобамі.

У тэкст вершаў кнігі «Вянок» унесены праўкі, зробленыя М. Багдановічам у асабістым экземпляры зборніка.

У першым томе, у раздзеле арыгінальных вершаў М. Багдановіча памылкова змешчаны пераклады вершаў Я. Купалы «Жніво» на рускую мову і О. Олеся «Астры» на беларускую мову [1].

На гэтым двухтомніку базіраваліся ўсе наступныя выданні выбраных твораў, якія выйшлі ў свет да 1957 года.

---

[1] Адносна верша О. Олеся памылка выпраўлена рэдакцыяй у 2-м томе (с. 410).

8. **Творы.** Вершы і апавяданні. Нарысы. (
уступ. артыкулам *Н. С. Перкіна*). Рэд. кал
гія: *В. В. Барысенка, В. В. Івашын, М.*
*Лынькоў, Ю. С. Пшыркоў.* Мінск, Акадэм
навук БССР, 1957, 591 стар. з партр. і і
8.000 экз. 12 р.

Апошняе, найбольш поўнае выданне мастацк
твораў[1] М. Багдановіча, падрыхтаванае Інстытут
літаратуры Акадэміі навук БССР.

Як і двухтомнік 1927—1928 гадоў, гэта выдан
акадэмічнага тыпу. Тэксты твораў нанова звера
ўкладальнікамі па першых публікацыях[2] і пракамен
раваны. У кнізе змешчаны таксама вершы, якія
ўваходзілі ў папярэднія зборы твораў і былі апубл
каваны ў апошнія гады ў перыядычным друку («Кр
тыку» 1910 г., «Не бядуй», «Крытыку» 1913 г., «Ма
Беларусь! Цяжка твайму сыну...», «Городская любовь
«В горячем споре», пераклад верша Янкі Купалы «Д
тебя, Отчизна предков моих...» на рускую мову. Упе
шыню апублікаваны з аўтографа пераклад верша укр
інскага паэта А. Крымскага «Тёплый гром. Цветя ч
решня...».

Аднак і гэтае выданне мастацкіх твораў М. Багд
новіча нельга лічыць поўным. У ім адсутнічае, напры
лад, верш «Беларусь, Беларусь! Агнём імя тваё м
гарыць...», арыгінал верша «Белым кветам адзета к
ліна...» (змешчаны толькі аўтарскі пераклад яго
рускую мову), уласны пераклад М. Багдановіча ап
вядання «Апокрыф» (пад назв. «Притча о васильках»
верш «Credo» і шэраг інш.

[1] Публіцыстычныя творы М. Багдановіча падрыхт
ваны да друку Інстытутам літаратуры АН БССР і б
дуць выдадзены ў 1961 годзе Выдавецтвам АН БСС

[2] Выпраўлены асобныя памылкі і недакладнасці, д
пушчаныя ўкладальнікамі першага выдання «Твора
(1927—1928) у наступных творах: «Вераніка», «В
панове, пазіраеце далёка», «Д. Д. Дзябольскаму
«Дзесь у хмарах жывуць павукі», «Змяіны цар» («Ц
мень. Сосны...»), «Купідон», «Летапісец», «Мне снілася
«Над возерам», «Над морам», «Падымі ў гару св
вока...», «Пэўна любіце вы, пане...», «У старым садзе
«Санет» («На цёмнай гладзі луж...»).

Верш украінскага паэта Олеся «Астры» памылкова змешчаны ў якасці арыгінальнага верша М. Багдановіча.

Рэцэнзіі на кн.:

Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая (**В. Крышталь**); 1958, 22 студзеня (**П. Ахрыменка**).

Часоп. «Полымя», 1959, № 2, с. 189—190 (**Н. Лапідус**).

### б) *Выбраныя творы*

9. **Выбраныя творы.** (З уступ. артыкулам *М. Ларчанкі*). Пад. рэд. *М. Ларчанкі* і *М. Клімковіча.* Мінск, Дзяржвыд. пры СНК БССР, 1940. 224 с. з партр. 5000 экз. 5 р.

10. **Выбраныя творы.** (З уступ. артыкулам *С. Майхровіча*). Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1946. 112 с. 10.000 экз. 6 р.

11. **Выбраныя творы.** Вершы, апавяданні і артыкулы. (З уступ. артыкулам *С. Майхровіча*). Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1952. 397 с. 5 р. 30 к.

## III. Кнігі М. Багдановіча, выдадзеныя для дзяцей

12. **Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык.** Малюнкі мастака *М. Сяяцкага.* Мінск, Дзяржвыд. пры СНК БССР, 1940. 12 с. з іл. 10.000 экз. 40 к.

13. **Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык.** Вельмі жаласная гісторыя, выкладзеная згодна з праўдай беларускім вершам. Малюнкі *А. Волкава.* Мінск, Дзяржвыд. БССР, Рэд. дзіцяч. літ., 1947. [20] с. з іл. 20.000 экз. 3 р.

14. **Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык.** Малюнкі *А. Волкава.* Мінск, Дзярж-

выд. БССР, 1952, 13 с. з іл. 30.000 экз. 1
40 к.

## IV. Кнігі М. Багдановіча, выдадзеныя ў перакладзе на рускую і украінскую мов

15. **Избранные стихи.** Пер. с белору *М. Исаковского, Б. Иринина, П. Семынин* Ред. и предисл. *Е. Мозолькова.* М., «Худо литература», 1940. 103 с. с портр. 10.000 эк 3 р. 75 к.

16. **Избранные произведения.** Пер. с бел рус. (Со вступ. статьей *Е. Мозолькова*). М Гослитиздат, 1953. 295 с. с портр. 10.000 эк 3 р. 45 к.

17. **Вінок.** Пераклад, вступна стаття й пр мітки Михайла Драй-Хмари. [Київ]. Дер вид України, 1929. 95 с. 2.000 экз.

# ТВОРЫ М. БАГДАНОВІЧА, ЯКІЯ НЕ УВАЙШЛІ Ў ВЫДАННІ ЗБОРАЎ ЯГО ТВОРАЎ

## а) Мастацкія творы

18. **Беларусь** («Беларусь, Беларусь! Агнём імя тваё мне гарыць...»). Верш.

У кн.: Беларускі каляндар на 1927 год. Вільна, 1927. с. *17*.

19. **Белым кветам адзета каліна...** (Верш 1912 г.).

Газ. «Наша Ніва» 1912, 23 лістапада, № 46.

Газ. «Літаратура і мастацтва» 1958, 7 чэрв., (у тэксце артыкула **Н. Ватацы** «Невядомы тэкст М. Багдановіча»).

20. **Не сердись на меня, тихий друг...** (Верш).

Газ. «Літаратура і мастацтва» 1957, 25 мая, (у тэксце артыкула **С. Александровіча** «Сцежкамі паэта»).

21. **Притча о васильках.** (Аўтарскі пераклад апавядання «Апокрыф» на рус. мову).

«Северная газета» 1914, № 1.

## б) Артыкулы

22. **Крестьянин-поэт С. Д. Дрожжин.**

Газ. «Северная газета», 1913, № 42.

23. **[Частушка]**. («Частушка — это именно

та песня, которую поет в настоящее вре
едва ли не вся деревенская Россия...»). Ня
кончаны артыкул 1913—1914 гг.

У дысертацыі: *Железняк Г. С.* Поэзия М. Богда
вича. Л., 1941, с. 239—241 [1].
Часоп. «Полымя», 1947, № 5, с. 158.
Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая.

24. **Братья чехи.** М., Книгоиздательст
К. Ф. Некрасова, 1914. 16 с. (Б-ка войн
№ 28).

25. **Львов.** (Артыкул аб гісторыі гор. Льв
ва і яго значэнні ў развіцці культуры і нав
кі).

Газ. «Голос» (Яраслаўль), 1914, № 194.

26. **Новая интеллигенция.** (Артык
1914 г.).

Часоп. «Жизнь для всех» (Петербург), 1914, № 5—
с. 796—803.
Часоп. «Полымя», 1957, №5 с. 159—162.

27. **Иван Франко.** (Артыкул 1916 г.).

Часоп. «Жизнь для всех» (Петроград»), 1916, №
с. 790.
Часоп. «Полымя», 1957, № 5, с. 159.

28. **Вобразнасць апісанняў у верш
В. Марцінкевіча.** («Галоўная розніца паэты
нага апісання ад празаічнага...»). Урывак
чарнавых накідаў М. Багдановіча.

У дысертацыі: *Железняк Г. С.* Поэзия М. Богда
вича. Л., 1941, с. 93.
Часоп. «Полымя», 1957, № 5, с. 158.

29. **О сказках думают так...** (Урывак арт
кула з чарнавых накідаў).

---

[1] Дысертацыя захоўваецца ў фондах фундамента
най бібліятэкі Ленінградскага універсітэта.

У дысертацыі: *Железчяк Г. С.* Поэзия М. Богдановича. Л., 1941, с. 241—242.

Часоп. «Полымя», 1957, № 5, с. 158 (пад назв. «Черновой незаконченный набросок»).

30. **Стремление найти метод научной критики...** (Урывак з артыкула з чарнавых накідаў).

У дысертацыі: *Железняк Г. С.* Поэзия М. Богдановича. Л., 1941, с. 75—76.

☆ ☆ ☆

Не змяшчаліся ў кнігах таксама некаторыя рэцэнзіі М. Багдановіча, якія публікаваліся ў свой час у Яраслаўскай газеце «Голос», 1914, №№ 3, 32, 79; 1915, № 139; 1916, №№ 12, 115, 132, 134, 139; ж.: «Русский экскурсант», 1914, № 5—6; ж. «Северные записки», 1915, февр. і ў інш. выданнях.

Некаторыя пісьмы М. Багдановіча, якія змяшчаюць цікавыя выказванні паэта па пытаннях літаратуры, надрукаваны ў часоп. «Полымя», 1958, № 3, с. 178—182.

Ёсць меркаванні, што пяру М. Багдановіча належыць таксама апавяданне «Несчастный случай» (подпіс *«М. Б.»,* газ. «Голос», 1913, № 99—100), што паэтам зроблены пераклад апавядання славацкага пісьменніка Святазара (Гурбана) Ваянскага «Юдава поле», падпісаны крыптанімам *«Б-ч»* (газ. «Наша ніва» 1909, 24 ліпеня, № 39), напісаны артыкул «Не жаласці, а праўды» (подпіс *«М. Б.»,* газ. «Наша ніва», 1911, 7 мая, № 14). Тэксты, якія прыпісваюцца М. Багдановічу, будуць змешчаны ў кнізе публіцыстыкі М. Багдановіча, якую рыхтуе да друку Інстытут літаратуры Акадэміі навук БССР.

*«Будзь-жа век малады*
*Поўны светлымі днямі!»*
*М. Багдановіч.*[1]

## ТВОРЫ М. БАГДАНОВІЧА, ПАКЛАДЗЕНЫЯ НА МУЗЫКУ

31. **Астры.** («У поўначы астры ў саду рас-цвілі...»). Раманс. Словы *О. Олеся.* Пер. з укр. *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.* Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

32. **Вечар** («Месяц круглы стаў на небе...»). (Для змешанага хору і саліста. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.* Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

33. **Глянь, як зорка ў цемні ляціць...** Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *М. Аладава.*

У нотах: **М. Аладаў.** — Глянь, як зорка ў цемні ляціць... Мінск, ДВБ, (1931), 4 с.

34. **Завіруха. («У бубны дахаў вецер б'е...»)** (Словы *М. Багдановіча.* Муз. *Э. Тырманд.* Для хору (a-capella).

У нотах: **Тырманд Э.** Хоры (a—capella). Словы *М. Багдановіча.* Мінск, ДВБ, 1956, с. 11—14.
Гл. таксама «Метель», № 44.

35. **Зімовая дарога.** («Шпарка коні імчацца ў полі»). Словы *М. Багдановіча.* Муз. *Э. Тырманд.*

Мелодыя апрацавана для хору (a-capella).

У нотах: **Тырманд Э.** Хоры (a—capella). Словы *М. Багдановіча.* Мінск, ДВБ, 1956, с. 16—23.

36. **Зімовая дарога.** («Шпарка коні імчацца

[1] М. Багдановіч. — «Маладыя гады». (Верш). У кн.: «Выбраныя творы», 1952, с. 109.

ў полі...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.* Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

37. **Зімой.** («Здароў, марозны, звонкі вечар!..»). Словы *М. Багдановіча.* Муз. *Э. Тырманд.* Для хору (a-capella).

У нотах: **Тырманд Э.** Хоры (a—capella). Словы *М. Багдановіча.* Мінск, ДВБ, 1956, с. 3—10.
Гл. таксама **«Зимний вечер», №** 38.

38. **Зимний вечер. [«Зімой»].** («Звенит морозный звонкий вечер...»). Романс. Слова *М. Богдановича.* Муз. *Л. Абелиовича.*

В нотах: **Абелиович Л.** Пять романсов на слова *М. Богдановича.* Для среднего голоса с сопровождением фортепьяно. М., «Советский композитор», 1957, с. 18—23.
Гл. таксама **«Зімой», №** 37.

39. **Зорка Венера.** («Зорка Венера ўзышла над зямлёю...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Народная мелодыя. Апрацоўка мелодыі *А. Багатырова.*

Часоп. «Работніца і сялянка», 1956, № 3, на вокл.
Газ. «Ніва» (Беласток), 1956, 11 сакав., № 2. 1956 г.
У нотах: Молодежные песни. Гомель, Гомельский обл. дом народ. творчества, 1956. (Навстречу 1-му областному фестивалю молодежи Гомельщины), с. 89—90.

Мелодыя апрацавана для хора (a-capella) С. Палонскім і М. Копасавым.

Апрацоўка *С. Палонскага* змешчана ў нотах: «Участнику фестиваля молодежи». Могилев, 1956 (Обл. упр. культуры, Могилевский обл. дом народного творчества), с. 69—74. Рукапіс нот захоўваецца ў бібліятэцы Беларускай Дзяржаўнай капэлы (Мінск). Му-

зыкальная апрацоўка *М. Копасава* (рукапіс) захс
ваецца ў бібліятэцы Дзяржаўнай харавой капэ.
(Мінск).

40. **Зорка Венера.** («Зорка Венера ўзышл
над зямлёю...»). Раманс. Словы *М. Багданов
ча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

41. **Маладыя гады.** («Маладыя гады, м
ладыя жаданні...»). Раманс. Словы *М. Багд
новіча.* Муз. *А. Багатырова.*

У нотах: **Багатыроў А.** — Пяць рамансаў. Для
ласа з ф-на. На словы М. Багдановіча. Мінск, ДЕ
149. с. 3—9.

42. **Маладыя гады.** («Маладыя гады, мал
дыя жаданні...»). Раманс. Словы *М. Багдан
віча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

43. **Маёвая песня.** Двухгалосны хор. Слов
*М. Багдановіча.* Муз. *Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

44. **Метель. [«Завіруха»].** («Как в бубн
ветер в крыши бьет...»). Романс. Сло
*М. Багдановіча.* Муз. *Л. Абеліовича.*

В нотах: **Абелиович Л.** Пять романсов на сл
М. Богдановича. Для среднего голоса с сопровожде
ем фортепьяно. М., Советский композитор, 1957, с. 9
13.

45. **Мушка-зелянушка.** Раманс. Слов
*М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.* Рук
піс захоўваецца ў удавы кампазітара.

46. **На чужыне.** («Вакол мяне кветкі пр
гожа красуюць...»). Раманс. Словы *М. Багд
новіча.* Муз. *А. Багатырова.*

У нотах: **Багатыроў А. — Пяць рамансаў.** Для голасу з ф-на. На словы М. Багдановіча. Мінск, ДВБ, 1949, с. 19—25.

47. **Набягае яно.** («Набягае яно вечарамі, начамі...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Багатырова.*

У нотах: **Багатыроў А** — Пяць рамансаў. Для голасу з ф-на. На словы М. Багдановіча. Мінск, ДВБ, 1949, с. 10—18.

48. **Над магілай.** («Каля шляху ў чыстым полі...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Багатырова.*

У нотах: **Багатыроў А.** — Пяць рамансаў. Для голасу з ф-на. На словы М. Багдановіча. Мінск, ДВБ, 30—35.

49. **Над могилой.** («У дороги в чистом поле...»). Романс. Слова *М. Богдановича.* Муз. *Л. Абелиовича.*

В нотах: **Абелиович Л. —** Пять романсов на слова М. Богдановича. Для среднего голоса с сопровождением фортепьяно. М. Советский композитор, 1957, с. 2—4.

50. **Не кувай ты, шэрая зязюля...** Двухгалосы хор. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.* Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

51. **Ноч.** («Ціха ўсё была на небе, зямлі і на сэрцы...»). Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Багатырова.* Для хору (a-capella).

У нотах: **Багатыроў А.** — Хоры (a-capella). Мінск, ДВБ, 1947, с. 9—12.

52. **Ночь.** («Все было тихо на земле...»). Романс. Слова *М. Богдановича.* Муз. и пер. *Л. Абелиовича.*

В нотах: **Абелиович Л.** — Пять романсов на сло М. Богдановича. Для среднего голоса с сопровожде ем фортепьяно. М. Советский композитор, 19 с. 14—17. («Всё было тихо на земле...»).

53. **Нявесела камару...** (Урывак з паэм «Мушка-зелянушка»). Словы *М. Багдановіч* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

54. **Ой лясы ды лугі разлогі...** Раманс. Сл вы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

55. **Падвей.** («Разгулялася вясёлая м цель...»). Раманс. Словы *М. Багданові* Муз. *М. Аладава.*

У нотах: **Аладаў М.** — Падвей. Словы М. Багд віча. Мінск, ДВБ, 1931, 8 с.

56. **Падвей.** («Разгулялася вясёлая цель...»). Змешаны хор (a-capella). Сло *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

57. **Песня беларускага мужыка.** («Я хл ў багатых прасіў і маліў...»). Раманс. Сл *М. Багдановіча.* Муз. *А. Багатырова.*

У нотах: **Багатыроў А.** — Пяць рамансаў. Для ласу з ф-на. На словы М. Багдановіча. Мінск, 1949, с. 26—29.

58. **Пра Лявоніху.** («Ах Лявоніха, Ляв ха мая...»). Мужчынскі дуэт. Словы *М. даноўіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

59. **Скірпуся.** («Ой, пайшла сабе Скір

на кірмаш...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

60. **Слуцкія ткачыхі.** («Ад родных ніў, ад роднай хаты...»). Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

61. **Слуцкія ткачыхі.** («Ад родных ніў, ад роднай хаты...». Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Багатырова.* Для хора (a-capella).

У нотах: **Багатыроў А.** — Хоры (a-capella) op. 11. Мінск, ДВБ, 1957, стар. 3—9.

62. **Сумна мне...** Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Е. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

63. **«Ты был, как месяц, одинокий...».** Романс. Слова *М. Богдановича.* Муз. *Л. Абелиовича.*

В нотах: **Абелиович Л.** — Пять романсов на слова М. Богдановича. Для среднего голоса с сопровождением фортепьяно. М., Советский композитор, 1957, с. 5—8.

64. **«Ты быў, як месяц, адзінокі...».** Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *М. Аладава.*

Рукапіс захоўваецца ў кампазітара.

65. **Устань, навальніца...** Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

66. **Уся ў слязах дзяўчына.** Раманс. Словы *М. Багдановіча.* Муз. *А. Туранкова.*

Рукапіс захоўваецца ў удавы кампазітара.

Першы грунтоўны артыкул, прысвечаны жыццю і творчасці М. Багдановіча, змяшчае ў сабе багаты фактычны матэрыял, які не страціў свайго значэння і на сёння.

75. **Цыганоў М.** Да біяграфіі М. Багдановіча. (Па матэрыялах губ. архіва Н.-Ноўгарада). Часоп. «Полымя», 1929, № 8—9, с. 162—166.

На падставе архіўных матэрыялаў аўтар артыкула ўдакладняе дату нараджэння паэта і расказвае аб некаторых фактах, якія характарызуюць яго вучобу ў Ніжагародскай гімназіі. М. Цыганоў лічыць, што «наша крытычная літаратура павялічвае надта рэвалюцыйную дзейнасць Максіма Багдановіча, якая зводзілася да пераймання рэвалюцыйна-настроенаму брату Вадзіму» (с. 166).

76. **Бядуля Зм.** Страцім-Лебедзь (Апавяданне-ўспаміны). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1941, 5 сакав. У пер. на рус. мову ў кн.: Зм. Бядуля. Избранное. Пер. с белорус. М., Гослитиздат, 1953, с. 608—614.

Успаміны аб тым часе, калі М. Багдановіч жыў у 1916 годзе ў Мінску разам з аўтарам успамінаў. У гэты час Максім Багдановіч напісаў сваю выдатную паэму «Страцім-Лебедзь». Змітрок Бядуля расказвае аб тым, як была напісана паэма.

77. **Дзябольскі Д.** Старонкі ўспамінаў. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1958, 5 лютага.

Успаміны таварыша Максіма Багдановіча па яраслаўскай гімназіі аб сустрэчах з паэтам у сценах гімназіі і дома.

78. **Гарбацэвіч В.** Чалавек чыстага сэрца. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 28 верасня.

Успаміны аб сустрэчах з Максімам Багдановічам у Яраслаўлі ў 1916 годзе.

78а. **Ивашин В.** М. Горький и белорусская литература начала XX века. Минск, Изд-во АН БССР, 1956.

199с. (Акад. наук БССР. Ин-т литературы и искусства).

На с. 46—55 о личных связях М. Горького с семьей М. Богдановича.

78б. **Лапидус Н.** Максим Горький и белорусский поэт Максим Богданович. (Тезисы доклада). В кн.: Тезисы докладов и сообщений 2-й конференции горьковедов Поволжья (июнь, 1959). Горький, 1959 (Горьковская комиссия при исполкоме Горьковского горсовета), с. 12—14.

Краткая информация о дружбе семей Богдановича и Горького и о влиянии Горького на творчество белорусского поэта.

79. **Максим Богданович в Минске.** (Заметка). В кн.: Минск. Справочник-путеводитель. Состав. Е. Садовский. Минск, 1956, с. 242—244.

Краткая биографическая справка о М. Богдановиче в период его жизни в Минске с осени 1916 по февраль 1917 года.

В справке приведена не публиковавшаяся прежде выдержка из протокола заседания Минской губернской продовольственной комиссии от 21 февраля 1917 г. о том, чтобы секретарю губернской комиссии М. А. Богдановичу «предоставить двухмесячный отпуск с сохранением содержания и выдать единовременно на лечение пособие в размере 200 рублей». Протокол этот хранится в фондах Государственного архива Минской области.

80. **Александровіч С.** Сцежкамі песняра. (Да 40-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая.

Нарыс аб паездцы ў Горкі і Яраслаўль, аб сустрэ-
чах аўтара з асобамі, ведаўшымі Максіма Багдановіча.
У тэксце нарыса ўпершыню апублікаваны верш
М. Багдановіча на рускай мове «Не сердись на меня,
тихий друг».

81. **Ватацы Н.** і **Лапідус Н.** Юнацкія гады
Максіма Багдановіча. Часоп. «Маладосць»,
1957, № 5, с. 19—20.

Сціслы біяграфічны нарыс. У тэксце нарыса дадзена
вытрымка з неапублікаваных раней успамінаў пра
Багдановіча яраслаўца Н. Г. Агурцова, якая характа-
рызуе погляды М. Багдановіча. Агурцоў прыводзіць
наступныя словы Максіма Багдановіча, якія паэт ска-
заў яму ў сувязі з выхадам у свет уласнага зборніка
вершаў «Вянок»: «За беларускай мовай не хочуць пры-
знаваць самастойнасці і самабытнасці. Не хочуць да-
пусціць і думкі, што на гэтай мове можна выразіць ус-
рухі чалавечай душы і даць любую літаратурную фор-
му. Я сваёй кніжачкай і хацеў паказаць, што ўсё гэта
магчыма».

У тэксце змешчаны партрэт Максіма Багдановіча,
фота будынка мужчынскай гімназіі ў Ніжнім Ноўгара-
дзе, у якім вучыўся паэт (1902—1908), і брашуры Мак-
сіма Багдановіча «Братья-чехи» (М., 1914).

82. **Лапідус Н.** Там, дзе вучыўся паэт. (Да
40-годдзя з дня смерці). Газ. «Мінская праў-
да», 1957, 25 мая.

Кароткі артыкул аб яраслаўскім перыядзе жыцця
Максіма Багдановіча.

У тэксце артыкула змешчана фота будынка, у якім
да рэвалюцыі знаходзілася яраслаўская гімназія, якую
паэт скончыў у 1911 г.; паведамляецца аб тым, што
яраслаўскім абласным архіве захоўваецца атэстат ст-
ласці паэта.

83. **Майхровіч С.** Максім Багдановіч.
Жыццё і творчасць, Мінск, Дзяржвыд. БССР,
1958. 202 с. 11 укл. л. партр. і іл. 7000 экз.
**6 р. 15 к.**

Біяграфічныя звесткі гл. у першым раздзеле кнігі на с. 5—23.

Змест першага раздзела: 1. Паходжанне бацькі паэта. Паэтычны дар маці. Культ вуснай народнай паэзіі. Любоў да бацькаўшчыны. Сістэма выхавання ў сям'і. Далучэнне да лепшых здабыткаў сусветнай паэзіі... — 2. У Ніжнім Ноўгарадзе. Паступленне ў гімназію. Удзел у рэвалюцыйных выступленнях. Пераезд у Яраслаўль. Захапленне гуманітарнымі навукамі. Мары аб Пецярбургскім універсітэце. Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Першае наведанне Беларусі. Пераезд у Мінск. Цяжкая хвароба. Смерць у росквіце таленту.

Рэцэнзіі на кнігу Майхровіча гл. у наступных выданнях: часоп. «Беларусь», 1958, № 9, с. 30 *(А. Макарэвіч)*; газ. «Літаратура і мастацтва», 1958, 6 верас. *(М. Грынчык)*.

84. **Чарнецкі М.** Памяці паэта. (Аб устанаўленні мемарыяльнай дошкі на будынку тэхналагічнага інстытута, дзе да рэвалюцыі размяшчалася Яраслаўская мужчынская гімназія, у якой вучыўся Максім Багдановіч). Часоп. «Беларусь», 1958, № 9, с. 23.

У заметцы змешчана фота адказнага сакратара Яраслаўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Паўла Фёдаравіча Лосева, братоў Максіма Багдановіча — Паўла і Міколы Багдановічаў і паэта Дзмітрыя Гарбунова.

85. **Александровіч С.** Над Волгай. (Нарыс). У кн.: С. Александровіч. Незабыўнымі сцежкамі. Мінск, Вучпедвыд. БССР, 1959. с. 49—59.

Нарыс аб ніжагародскім і яраслаўскім перыядах жыцця М. Багдановіча, напісаны ў форме падарожжа ад Горкага да Яраслаўля і наведання памятных мясцін, звязаных з жыццём і літаратурнай дзейнасцю паэта.

Аўтар нарыса дае замалёўкі чароўных волжскіх берагоў, якія натхнілі М. Багдановіча стварыць апавяданне «Шаман»; расказвае аб сваіх сустрэчах і размовах з братам М. Багдановіча Паўлам Адамавічам Баг-

дановічам і былым супрацоўнікам газеты «Голос», у якой супрацоўнічаў паэт, Аляксандрам Дзмітравічам Цітовым.

У тэксце змешчаны партрэт М. Багдановіча і 2 здымкі дома ў Яраслаўлі (вул. Чайкоўскага, № 29), дзе ў 1914—1915 г.г. жыў М. Багдановіч; Дзямідаўскага ліцэя, у якім вучыўся паэт.

Рэцэнзію на кнігу С. Александровіча гл. у наступных выданнях:

часоп. «Маладосць», 1959, № 12, с. 147—148 (*Ярош М.* Па нязведаных сцежках);

часоп. «Беларусь», 1960, № 1, с. 31 (*Усікаў Я.* Пабольш такіх кніг);

газ. «Літаратура і мастацтва», 1959, 30 верас. (*Майхровіч С.* Па дарагіх мясцінах);

газ. «Магілёўская праўда», 1959, 8 снеж. (*Усікаў Я.* Сцежкамі нашых песняроў).

## 2. Эстэтычныя погляды М. Багдановіча

86. **Іваноў М.** Паэт і яго крытыкі. (Да 30-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1947, 21 чэрвеня.

У артыкуле ставіцца пытанне аб тым, што пра творчасць Максіма Багдановіча напісана многа «юбілейных» артыкулаў, у якіх не даецца ўсебаковай, а часам і правільнай характарыстыкі эстэтычных поглядаў паэта і ідэйнага зместу яго твораў.

Аўтар разглядае артыкулы М. Карпачова «Максім Багдановіч» (газ. «Гомельская праўда», 1947, 25 мая), Л. Бэндэ «Максім Багдановіч» (газ. «Гродзенская праўда» 1947, 25 мая), Я. Міхалапа «Выдатны беларускі паэт» (газ. «Гродзенская праўда» за 25 мая 1947 г.), Н. Пятровіча «Паэт-дэмакрат» (газ. «За Радзіму», 1947, 25 мая), М. Ларчанкі «Максім Багдановіч» (газ. «Савецкая Беларусь», 1947, 25 мая) і Я. Казекі «Максім Багдановіч» (газ. «Чырвоная змена» 1947, 27 мая).

87. **Перкін Н.** Эстэтычныя погляды Максіма Багдановіча. Часоп. «Полымя», 1948, № 11, с. 101—107.

Н. Перкін даводзіць у артыкуле думку аб тым, што савецкае літаратуразнаўства зусім правільна адкінула заганны погляд на Багдановіча як на паэта «чыстай красы», справядліва адзначае дэмакратычны кірунак і гуманістычную сутнасць творчасці паэта.

Артыкул напісаны на аснове аналіза крытычных прац М. Багдановіча «В. Самійленко» (1916), «Поэзія гениального ученого» (1911), «Об интересном мнении г. Глебова» (1915), рэцэнзіі на кнігу Рабіндраната Тагора «Гітаджалі» (1914), апавяданняў «Музыка», «Апокрыф», «Апавяданне аб іконніку і залатару» і «Мадонна», вершаў «Дзе вы, лясоў, палёў цвяты?», «Уступ», «Мае песні», «Ліст» і інш.

88. **Перкін Н.** За правільную ацэнку творчай спадчыны М. Багдановіча. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1949, 20 жніўня.

Аўтар артыкула лічыць, што ніхто з дзеячоў беларускай літаратуры не выклікаў такой разнастайнасці трактовак, як Максім Багдановіч. Н. Перкін аналізуе і крытыкуе тры артыкулы, якія, на яго думку, змяшчаюць у сабе многа няправільных выказванняў аб творчасці М. Багдановіча. Гэта ўступныя артыкулы да «Выбраных твораў» М. Багдановіча 1940 года *(М. Ларчанкі)* і 1946 года *(С. Майхровіча),* а таксама артыкул *В. Гальперына* «Аб перажытках буржуазнага нацыяналізма ў беларускім літаратуразнаўстве», змешчаны ў «Литературной газете» за 12 мая 1948 г.

89. **Барсток М.** Пятро Глебка. Паэтычная творчасць. Мінск, выд-ва Акад. навук БССР, 1952. 164 с. (Акадэмія навук БССР, Ін-т літаратуры і мастацтва).

Аб поглядах М. Багдановіча на мастацтва і яго апавяданні «Сон-трава» гл. на с. 20—21.

90. **Акулич А.** О мировоззрении М. А. Богдановича. «Ученые записки (Минского гос. пед. ин-та им. А. М. Горького)». Вып. 6, юбилейный. Минск, 1956 (1957), с. 121—132.

В статье прослеживается, как в общественно-исторических условиях начала XX века формировалось ми-

ровоззрение молодого поэта-демократа Максима Богдановича.

Автор доказывает, что в реалистических произведениях М. Богдановича выражен протест против имущественного неравенства людей, звучит призыв к трудящимся бороться за свое социальное и национальное раскрепощение. «Демократизм М. Богдановича, — пишет А. Л. Акулич, — его близость к трудящимся массам крестьянства, заветные думы, чаяния и настроения, которых он выражал, помогли ему заметить в народе неиссякаемую силу, энергию и мужество в непримиримой борьбе за свою свободную и радостную жизнь».

Автор отмечает также некоторую непоследовательность Максима Богдановича в вопросах теории искусства.

91. **Перкін Н.** Максім Багдановіч. У кн.: Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Дапаможнік для студэнтаў ВНУ. Мінск, Вучпедвыд. БССР, 1956. с. 223—246.

Анатацыю гл. № 101.

92. **Барсток М.** Максім Багдановіч. (Да 40-годдзя з дня смерці). Часоп. «Савецкая школа», 1957, № 3, с. 8—23.

Аб эстэтычных поглядах паэта гл. на с. 8—11.

93. **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1958. 202 с., II укл. л. партр. і іл. 7000 экз. 6 р. 15 к.

Светапогляду Максіма Багдановіча прысвечаны другі раздзел кнігі (с. 40—104).

Змест II раздзела: 1. Часы змрочнай рэакцыі. У абарону рэалістычнага мастацтва. «Чыстая краса» сімвалістаў. Два процілеглыя творчыя метады. Жыццё і мастацтва паводле Максіма Багдановіча. Гімн жыццю і свабодзе чалавека. Паэт-грамадзянін. — 2. Народная міфалогія і паэтычнае хараство. Выразна рэалістычны пачатак паэзіі М. Багдановіча. Патрыя-

тычныя думы. Паданні старажытнасці далёкай. А. Я. Багдановіч аб народных паданнях і павер'ях. Вернасць рэалістычнаму метаду. — 3. Літаратурна-тэарэтычныя погляды Максіма Багдановіча. «Музыка» і сацыяльная прырода мастацтва. Спяваць так, як спявае сам народ. Вобраз народнага песняра. Да шырокіх сацыяльных абагульненняў. Эстэтычны маніфест паэта. — 4. Роля песняра і песеннай творчасці. Песня і верш «Апокрыф». Думкі аб сацыяльнай прыродзе прыгожага. «Апавяданне аб іконніку і залатару». Характэрныя асаблівасці эстэтычных меркаванняў паэта. За паэзію высокіх дум і хвалюючых пачуццяў...—5. Пясняр перш за ўсё павінен быць грамадзянінам. Беларуская літаратура «ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу». «Забыты шлях» і эстэтычныя густы паэта. Уплывы дэмакратычнай рускай культуры. Творчае асэнсаванне вуснай народнай паэзіі. М. Багдановіч і творчасць Купалы і Коласа. Погляды на паэзію Шаўчэнкі.

Рэцэнзіі на кнігу Майхровіча гл. у наступных выданнях: часоп. «Беларусь», 1958, № 9, с. 30 *(А. Макарэвіч);* газ. «Літаратура і мастацтва», 1958, 6 верас. *(М. Грынчык).*

Гл. таксама артыкул С. Майхровіча «Эстэтычныя погляды М. А. Багдановіча». (У дапамогу настаўніку). «Настаўніцкая газета», 1946, 21 лістапада.

## 3. Літаратурная дзейнасць М. Багдановіча

### *а) Кнігі*

94. **Ларчанка М.** Творчасць Максіма Багдановіча. Стэнаграма публічнай лекцыі, прачытанай у Мінску. Мінск, выд. Акад. навук БССР, 1949, 20 с. (Т-ва па распаўсюджванню паліт. і навук. ведаў Беларус. ССР). 10.000 экз. 1 р.

Кароткія біяграфічныя звесткі і агляд літаратурнай творчасці. Аўтар брашуры разглядае Максіма Багдановіча як дэмакрата, глыбока прагрэсіўнага пісьменніка-патрыёта, які «верыў у сілы народа і яго літаратуры» (с. 7).

95. **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць. Мінск, Дзяржвыд. БССР,

1958. 202 стар., 11 укл. л. партр. і іл. 7.000 экз. 6 р. 15 к.

Першы раздзел кнігі (с. 5—39) складае падрабязны біяграфічны нарыс. Заканчваецца ён характарыстыкай літаратурнага жыцця 1905—1908 г. г., тых умоў, у якіх пачаў пісаць паэт, і пазіцыі, якую заняў М. Багдановіч у літаратурнай барацьбе. «Пачынаючы з першых крокаў супрацоўніцтва ў «Нашай ніве» (1907), — кажа аўтар, — ён звязаў свой лёс з лёсам народнай інтэлігенцыі, выдатнымі прадстаўнікамі якой былі беларускія рэвалюцыйныя дэмакраты Купала, Колас, Цётка, Гартны і інш.»

У другім раздзеле кнігі (с. 40—104) дадзен малюнак літаратурнага жыцця нашай краіны ў часы сталыпінскай рэакцыі і сфармуліраваны эстэтычныя погляды Максіма Багдановіча, паэта-грамадзяніна, які выступаў за арганічную еднасць мастацтва і жыцця. На старонках 100—104 зроблены заўвагі аб паэтычнай мове пісьменніка.

Трэці раздзел (с. 105—172) прысвечан творчым сувязям Максіма Багдановіча з народнаю творчасцю і сусветнай літаратурай, таму новаму, што ўнёс М. Багдановіч у беларускую літаратуру, а таксама ролі М. Багдановіча як перакладчыка.

У апошнім, чацвертым раздзеле (с. 173—199), падрабязна характарызуецца грамадзянская лірыка М. Багдановіча, у якой праявілася свабодалюбства, рэвалюцыйна-дэмакратычныя імкненні, адмаўленне самадзяржаўна-буржуазнай рэчаіснасці і аптымізм аўтара. Заканчваецца гэты раздзел вызначэннем месца паэтычнай спадчыны М. Багдановіча ў беларускай літаратуры.

Рэцэнзіі на кн. гл. у наступных выданнях: часоп. «Беларусь», 1958, № 9, с. 30 *(А. Макарэвіч)*; газ. «Літаратура і мастацтва», 1958, 6 верасня *(М. Грынчык)*.

Артыкулы С. Майхровіча, прысвечаныя творчасці М. Багдановіча, друкаваліся ў наступных выданнях: газ. «Советская Белоруссия», 1945, 12 авг.; «Настаўніцкая газета», 1946, 21 лістап.; в кн.: Багдановіч М. Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1946, с. 3—29; Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1952, с. 3—20,

Избранные произведения. Пер. с белорус. М., Гослитиздат, 1953, с. 3—13; газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 29 мая.

### *б) Артыкулы і раздзелы кніг*

96. **Колас Я.** Выдатны паэт і крытык. (Да 30-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1947, 24 мая; у кн.: Колас Я. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, Дзяржвыд. БССР. 1957, с. 241—242.

У артыкуле дадзена высокая ацэнка паэтычнага майстэрства Максіма Багдановіча і яго літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў. «Максім Багдановіч, — кажа Якуб Колас, — па праву заняў пачэснае месца ў нашай маладой паэзіі як высокаталенавіты паэт і майстра паэтычнай формы. Сярод беларускіх паэтаў Максім Багдановіч вылучаўся глыбокай і шырокай адукацыяй, тонкім разуменнем і пачуццём паэзіі. Але яму бракавала ведаў жывога беларускага слова: гадаваўся ён далёка ад беларускай зямлі. Гэту нястачу пры яго здольнасцях і замілаванні да свайго народа, да яго побыту, культуры і мовы ён лёгка папоўніў-бы, калі-б яго жыццё не абарвалася так рана... Але і тое, што напісаў ён за сваё кароткае жыццё, ставіць яго ў першыя рады нашых лепшых песняроў.

Максім Багдановіч быў і не менш таленавітым літаратурным крытыкам. Яго артыкулы ў гэтай галіне здзіўляюць спеласцю думкі, глыбокім пранікненнем у сутнасць паэтычных твораў... На маю думку, мала хто з украінскіх і рускіх крытыкаў даў такі тонкі, усебаковы аналіз і ацэнку паэтычнага дару вялікага украінскага кабзара, як Максім Багдановіч».

97. **Чорны К.** Паэт народа. (Да 25-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Савецкая Беларусь», 1942, 30 мая.

Кароткі газетны артыкул. Кузьма Чорны характарызуе ў ім Максіма Багдановіча як паэта-грамадзяніна. Кузьма Чорны піша аб Багдановічу: «Вялікі гра-

мадзянін і патрыёт радзімы, ён усё сваё жыццё аддаў служэнню свайму народу... Чалавек шырокай адукацыі, энцыклапедыст у самым поўным сэнсе слова, Максім Багдановіч ад самых пачаткаў сваёй творчасці быў у абсягу перадавых агульначалавечых ідэй, у якіх ён знаходзіў месца беларускай нацыянальнай думцы. Адсюль ідзе вялікая прагрэсіўнасць яго творчасці і яе абсалютная супроцьлегласць рэакцыйнай нацыяналістычнай абмежаванасці.

Ён любіў свой народ і сваю родную зямлю. Шчасце свайго народа ён бачыў у выхадзе яго на шырокую арэну агульначалавечай гісторыі. Як роўны з роўнымі, беларускі народ мысліўся ім сярод усіх іншых народаў, і ў гэтым галоўныя матывы яго творчасці. Адсюль і матывы нянавісці да ўсіх ворагаў народа і да ўсяго рэакцыйнага і цёмнага. І нарэшце — адсюль ідуць матывы веры ў перамогу народа над усімі цёмнымі сіламі».

98. **Мозольков Е.** Максим Богданович. В кн.: М. Богданович. Избранные стихи. М., Гослитиздат, 1940. с. 3—9.

Кароткі артыкул аб жыцці і дзейнасці паэта.

99. **Корман Б.** Паплечнік па барацьбе. (Да 60-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1951, 8 снежня.

Тэма артыкула — Я. Купала і М. Багдановіч. Аўтар абгрунтоўвае факты, якія сведчаць аб ідэйна-творчай блізкасці Багдановіча да Купалы ў 1912—1917 г.г.

У артыкуле аналізуюцца творы Я. Купалы «Раскіданае гняздо», «Бандароўна» і «Курган» і М. Багдановіча — «Эмігранцкая песня», «Мяжы», «Максім і Магдалена» і палемічны верш «Ліст»...

100. **Клімковіч М.** Максім Багдановіч. «Настаўніцкая газета», 1952, 29 мая.

Адзначыўшы шматграннасць таленту М. Багдановіча (лірыка, эпас, проза), аўтар артыкула аналізуе сацыяльна-палітычную лірыку паэта.

101. **Перкін Н.** Максім Багдановіч. У кн.: Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры. Дапаможнік для студэнтаў ВНУ. Рэд. калегія: Барысенка В. В., Броўка П. У. і Лынь-

коў М. У. Мінск, Вучпедвыд. БССР, 1956. с. 223—246.

У артыкуле разгледжаны эстэтычныя погляды М. Багдановіча і яго паэтычнае майстэрства. Думкі аўтара артыкула ілюструюцца аналізам крытычных артыкулаў паэта і паэтычных яго твораў.

Н. Перкін даводзіць прагрэсіўныя, выразна дэмакратычныя перакананні М. Багдановіча на аснове аналізу сацыяльна-палітычнай, любоўнай і пейзажнай лірыкі, а таксама вершаў на фальклорныя сюжэты і матывы.

Заканчваецца артыкул разглядам лексікі і мастацкіх сродкаў паэта.

102. **Перкін Н.** Максім Багдановіч. (Уступ. артыкул). У кн.: М. Багдановіч. Творы. Вершы, апавяданні, нарысы. Мінск, АН БССР, 1957. с. 5—22.

У артыкуле дадзена сціслая характарыстыка эпохі і ўмоў, у якіх развівалася творчасць паэта, кароткія біяграфічныя звесткі, характарыстыка паэтычнай творчасці М. Багдановіча і яго дзейнасці як крытыка і публіцыста.

Аўтар разглядае вершы паэта грамадзянскага гучання, пейзажную лірыку, вершы, у якіх вырашаюцца маральна-этычныя праблемы і выказваюцца погляды паэта на мастацтва. Асаблівую ўвагу звяртае аўтар на эстэтычныя погляды паэта і адносіны яго да фальклору. Заканчваецца артыкул сціслай характарыстыкай асноўных памылак, дапушчаных асобнымі літаратуразнаўцамі пры ацэнцы літаратурнай спадчыны Максіма Багдановіча.

103. **Барсток М.** Максім Багдановіч. (Да 40-годдзя з дня смерці). Часоп. «Савецкая школа», 1957, № 3, с. 8—23.

Артыкул знаёміць з эстэтычнымі поглядамі (стар. 8—11), ідэйнай накіраванасцю, тэматыкай і жанравай разнастайнасцю паэтычнай творчасці М. Багдановіча. Аўтар артыкула звяртае ўвагу чытача на плённае ўздзеянне на творчасць паэта фальклору (с. 18—21) і рускай класічнай літаратуры (с. 21—22).

## 4. М. Багдановіч і фальклор

104. **Савановіч Д.** Фальклор у творчасці М. Багдановіча. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1941, 19 красавіка.

Аўтар артыкула разглядае ў творчасці Максіма Багдановіча тры групы фальклорных матываў.

У першай з іх вобразы, народжаныя фантазіяй народа, уключаюцца ў іншую ідэйна-вобразную сістэму, падначальваюцца іншым мастацкім заданням.

Другую групу складаюць, па думцы аўтара, тыя рэчы, у якіх фальклорная эмацыянальнасць, не падначальваючы сабе кампазіцыі верша, служыць разам з тым сродкам выяўлення яго лірычнай тэмы.

Трэцюю, не менш значную і яркую групу складаюць яго вершы, пабудаваныя на фальклорнай эмацыянальнасці («Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык», «Максім і Магдалена», «Ой лясы-бары, ды лугі-разлогі», «У мястэчку Церасцечку», «Лявоніха»).

Аўтар звяртае ўвагу на падбор жанраў фальклору, над якімі працуе Багдановіч: гэта жанры жартаўлівай песні і танца, любоўнай і сямейнай песні і загавору.

105. **Сагараў Л.** Максім Багдановіч і фальклор. Часоп. «Беларусь», 1946, № 10, с. 47—49.

Аналізуючы паэтычныя творы М. Багдановіча, аўтар прыходзіць да наступных вывадаў: «Багдановіч падымае велізарныя пласты беларускага фальклору ў яго самых розных відах. Тут і вобразы, што ўтрымаліся ў мастацкай культуры народа з часоў міфалагічнага мышлення, і матывы старажытнага гераічнага эпасу, і элементы гістарычных, бытавых, салдацкіх, абрадавых песень, і ўвесь разналікі арсенал выяўленчых сродкаў паэтычнай гутарковай народнай мовы. Усё гэтае багацце Багдановіч пераплаўляе і перакоўвае ў сваёй творчай майстэрні ў адпаведнасці са сваімі паэтычнымі задумамі і стварае той свет прыгажосці, які чаруе і аблагароджвае душу, збліжае яе з агульначалавечымі ідэаламі, кліча на новыя подзвігі ў барацьбе за ўрачыстасць жыцця» (с. 47).

У артыкуле дэталёва аналізуюцца паэмы М. Багдановіча «Страцім-Лебедзь», «Максім і Магдалена» і «Мушка-зелянушка і камарык-насаты тварык».

106. **Грынчык М.** Паэт і творчасць народа. (Да 40-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва». 1957, 25 мая.

М. Грынчык палемізуе з тымі аўтарамі, якія ўвесь час адзначаюць «кніжныя» фактары станаўлення светапогляду М. Багдановіча, у тым ліку і яго поглядаў на фальклор.

«...Калі гаварыць аб сапраўдных вытоках паэзіі М. Багдановіча, — адзначае аўтар артыкула, — то відавочна, што яны б'юць з самых глыбінь народнага жыцця і тых гістарычных падзей, што азнаменавалі сабою пачатак нашага стагоддзя».

Аўтар даводзіць сваю думку разглядам цэлага шэрагу мастацкіх і публіцыстычных твораў паэта.

Побач з тэкстам артыкула ў газеце змешчаны партрэт М. Багдановіча і фота дома (рэканструяванага пасля Вялікай Айчыннай вайны) па вуліцы М. Горкага ў Мінску, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч.

107. **Барсток М.** Максім Багдановіч. (Да 40-годдзя з дня смерці). Часоп. «Савецкая школа», 1957, № 3, с. 8—23.

Аб фальклорных матывах творчасці М. Багдановіча гл. с. 18—21.

108. **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Жыццё і творчасць. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1958. 202 с. 6 р. 15 к.

Аб ацэнцы М. Багдановічам народнай творчасці і фальклорных матывах яго ўласнай творчасці гл. на с. 87—104, 153—172.

Анатацыю на кнігу гл. пад № 95. Рэцэнзіі на кнігу Майхровіча змешчаны ў часопісе «Беларусь», 1958, № 9, с. 30 *(А. Макарэвіч)* і ў газеце «Літаратура і мастацтва», 1958, 6 верасня *(М. Грынчыка)*.

109. **Грынчык М.** Народная паэзія ў ранняй творчасці М. Багдановіча. (1908 — 1910). У кн.: Беларуская літаратура. Даследаванні і публікацыі. Вып. 2 Мінск, АН БССР,

1959. (Акад. навук БССР. Ін-т літаратуры імя Я. Купалы). с. 61—88.

На аснове разгляду ранніх вершаў М. Багдановіча ва ўсёй іх ідэйнай і эстэтычнай разнастайнасці, М. Грынчык даводзіць думку аб тым, што ўжо з самага пачатку творчае развіццё паэта ішло па рэалістычнаму шляху. «Нават так званая «міфатворчасць», — піша аўтар, — ... займаючы сваеасаблівае месца ў творчым росце Багдановіча, сваімі найбольш істотнымі ідэйна-мастацкімі элементамі арганічна спалучалася са ўсёй ідэйна-эстэтычнай канцэпцыяй пісьменніка-рэаліста. Фальклорная фантастыка ў міфалагічных вершах носіць характар свядома ўжытага мастацкага сродку, прыёму, пры дапамозе якога раскрыты не фантастычныя з'явы ці сутнасці, як гэта было ў тагачасных сімвалістаў, а рэальная прыгажосць беларускай прыроды... Такі «міфалагізм» мог адыграць і адыграў сваю самастойную ролю ў працэсе далейшага творчага фармавання Багдановіча не толькі ў сэнсе непасрэднай зацікаўленасці творчасцю народа, але і ў сэнсе прыдання яго ранням творам беларускага этнаграфічнага каларыту. Усё гэта — станоўчы факт. Аднак яшчэ больш важна тое, што іменна гэтым шляхам ішоў Багдановіч да паступовага асэнсавання адной з найбольш актуальных літаратурна-грамадскіх праблем таго часу — праблемы народнасці літаратуры ў яе прыватным, аднак надзвычай істотным аспекце творчых суадносін з фальклорам...

Вось чаму неабходна рашуча адкінуць неабгрунтаваныя і павярхоўныя сцвярджэнні тых крытыкаў, якія расцэньваюць раннія міфалагічныя вершы Багдановіча як нейкую выпадковую, неарганічную, нехарактэрную для яго творчага вобліку з'яву і спрабуюць або пагардліва «адмахнуцца» ад гэтых твораў, або адкрыта вытлумачыць іх як праяўленне сімвалістычных уплываў» (с. 86—87).

## 5. Творчыя сувязі М. Багдановіча з рускай, украінскай і замежнай літаратурамі. Максім Багдановіч як перакладчык

110. **Лапідус Н.** Максім Багдановіч — перакладчык. Часоп. «Полымя», 1959, № 7, с. 130—138.

Н. Лапідус аналізуе паэтычныя і празаічныя пераклады М. Багдановіча з рускай, украінскай і замежных літаратур, а таксама разглядае крытычныя артыкулы паэта, прысвечаныя гэтым літаратурам, і выказванні М. Багдановіча па пытаннях тэорыі і практыкі мастацкага пераклада.

111. **Клімковіч М.** Аб жыватворчым уплыве рускай літаратуры на беларускую літаратуру. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1955. 184 с. 10.000 экз. 6 р. 15 к.

Аб жыватворчым уплыве рускай літаратуры на фарміраванне светапогляду і творчасць М. Багдановіча гл. на с. 82—94, 100—101.

112. **Ларчанка М.** З гісторыі руска-беларускіх літаратурных сувязей. («Слова аб палку Ігаравым» і беларуская літаратура). «Ученые записки Белорусского гос. ун-та им. В. И. Ленина», 1951 (юбилейный выпуск), с. 153—164.

Аб паэтычным перакладзе ўрыўка з «Слова аб палку Ігаравым», выкананым М. Багдановічам, гл. на с. 158—159.

113. **Смолкин М.** О традициях Пушкина. Ж. «Советская отчизна», 1957, № 1, с. 111—123.

О пушкинских традициях в творчестве М. Богдановича см. на с. 114—117.

Разбирая ряд поэтических произведений М. Богдановича («Вероника», «Переписчик», «Летописец», «В деревне», «Письмо»... и др.), автор статьи возражает критикам, у которых «имелась тенденция вести Богдановича от символистов (влияние которых, и не всегда плохое, отрицать, конечно, нельзя), а роль русской классической поэзии в формировании литературных интересов поэта почти совершенно не принималась во внимание». М. Смолкин доказывает, что «... Богданович вырос на русской классической поэзии. Она имела на него такое же влияние, как и народная поэзия...» (с. 114).

114. **Ивашин В.** М. Горький и белорусская литература начала XX века. Минск, Изд-во АН БССР, 1956. 199 с. (Акад. наук БССР, Ин-т литературы и искусства).

На с. 46—55 о личных связях М. Горького с семьей М. Богдановича. О животворном влиянии Горького на творчество М. Богдановича см. на с. 110—112, 119—122, 137—138, 156—162, 171—172, 178—179, 192.

115. **Лапидус Н.** Максим Горький и белорусский поэт Максим Богданович (Тезисы доклада). В кн.: Тезисы докладов и сообщений 2-й конференции горьковедов Поволжья (июль, 1959). Горький, 1959 (Горьковская комиссия при исполкоме Горьковского горсовета), с 12—14.

Краткая информация о дружбе семей Богдановича и Горького и о влиянии Горького на творчество белорусского поэта.

116. **Івашын В.** Невядомыя пераклады твораў Янкі Купалы. Часоп. «Беларусь», 1955, № 5, с. 12.

Сярод іншых аб вершы Я. Купалы «Жніво», перакладзеным на рускую мову Максімам Багдановічам (у «Творах», т. 1, (1927) пераклад гэты памылкова змешчан разам з арыгінальнымі творамі М. Багдановіча).

117. **Колас Я.** Шаўчэнка і беларуская паэзія. У кн.: Колас Я. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1957, с. 174—188.

Аб артыкулах М. Багдановіча, прысвечаных вялікаму украінскаму песняру і аб перакладзеных паэтам вершах Тараса Шаўчэнкі гл. с. 112—114. Гл. таксама № 96.

118. **Ахрыменка П.** Т. Г. Шаўчэнка і бе-

ларуская літаратура. Мінск, выд-ва Акад. навук БССР, 1952. 32 с. (Т-ва па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў Беларус. ССР).

Аб М. Багдановічу як папулярызатару і перакладчыку твораў Тараса Шаўчэнкі гл. на с. 14—18.

119. **Охрименко П.** Максим Богданович и украинская литература. «Ученые записки» (Гомельского педагогического ин-та им. В. П. Чкалова), 1954, вып. I, с. 91—109.

П. Охрименко знакомит читателей с критическими статьями М. Богдановича, посвященными украинской литературе. Особенно детально разбирает он статью «Краса и сила», посвященную Тарасу Шевченко. По мнению автора, эта статья «была (несмотря на отдельные, в целом незначительные элементы формализма) первой основательной разработкой поэтического мастерства шевченковского стиха, причем оставалась единственной в этой области исследования вплоть до—125-летнего юбилея со дня рождения Т. Г. Шевченко до 1939 года» (с. 92).

Проанализировав и другие литературно-критические статьи Богдановича, П. Охрименко высказывает мысль, что «работы Максима Богдановича о Т. Г. Шевченко относятся к передовой научно-критической литературе дооктябрьского периода... Эти работы в свое время сыграли видную общественную роль» (с. 96).

Далее в статье рассматриваются поэтические и прозаические переводы М. Богдановича произведений украинской литературы — Шевченко, Франко и др.

В конце статьи автор говорит о влиянии украинской литературы на творчество Максима Богдановича.

См. также следующие статьи П. Охрименко: «Переклади М. Богдановича з української літаратури» (Літ. газета», Київ, 1952, 22 мая), «Максим Богданович и Т. Г. Шевченко» (газ. «Советская Белоруссия», 1952, 23 мая) и брошюру его «Шевченко і Білорусія» «Київ, 1960. Аб Багдановічу гл. с. 17, 29—31).

120. **Івашын В.** Максім Багдановіч аб украінскай літаратуры. Часоп. «Полымя», 1954, № 4, с. 118—124.

Анатацыю гл. пад № 132.

121. **Мошынский С.** Украинские классики в русских переводах. Ж. «Новый мир», 1954, № 3, с. 223—231.

О переводах рассказов I. Франко, выполненных М. Богдановичем, см. на с. 228.

122. **Лапидус Н.** М. Богданович и Т. Шевченко. «Ученые записки (Белорус. гос. ун-та), вып. XXVII, серия филологическая. Минск, 1956, с. 200—212.

Автор анализирует статьи М. Богдановича о Шевченко («Краса и сила», «Памяти Шевченко») и выполненные белорусским поэтом переводы стихов Тараса Шевченко на русский язык.

«В условиях, — пишет Н. Лапидус, — когда черносотенцы во главе с Пуришкевичем вели разнузданную кампанию против Шевченко, белорусский поэт Максим Богданович выступил в защиту великого певца украинского народа и отметил мировое значение его поэзии» (с. 200).

Рассматривая поэтическое мастерство переводов М. Богдановича с укр. на рус. язык, Н. Лапидус сравнивает их с переводами, выполненными другими авторами.

123. **Вараповіч С.** Максім Багдановіч і украінская літаратура. Часоп. «Беларусь», 1957, № 5, с. 14.

Аўтар разглядае Максіма Багдановіча як перакладчыка, крытыка і прапагандыста украінскай літаратуры.

124. **Ахрыменка П.** Фальклорна-літаратурныя сувязі украінскага і беларускага народаў. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1959, стар. 204, 4.000 экз. 6 р. 30 к.

Аб літаратурных сувязях творчасці М. Багдановіча з украінскай літаратурай гл. на сс.: 111—112 (аб уплыве украінскай літаратуры на творчасць М. Багдановіча); 131—134, 135—136 (аб перакладах твораў М. Багдановіча на украінскую мову); 137—140 (аб

творах украінскай літаратуры, перакладзеных М. Багдановічам на беларускую і рускую мовы); 153—158 (аб літаратуразнаўчых работах М. Багдановіча, прысвечаных разгляду украінскай літаратуры).

125. **Перкін Н.** М. Багдановіч і культура славянскіх народаў. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1947, 24 мая.

Аналіз літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў М. Багдановіча. «Выхаваны на лепшых традыцыях рускай літаратуры, — піша аўтар, — успрыняўшы вялікія гуманістычныя ідэі папярэдніх і сучасных яму мысленнікаў і паэтаў, ён (Багдановіч) быў прыхільнікам сапраўднага братэрства паміж народамі, барацьбітам за іх шчасце і свабоду нацыянальнага развіцця».

126. **Ватацы Н. і Лапідус Н.** Максім Багдановіч аб чэшскім народзе. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 15 чэрв.

Артыкул знаёміць са зместам брашуры М. Багдановіча «Братья-чехи» (М., 1914), якая не ўвайшла ў зборы твораў паэта.

127. **Майхровіч С.** Выдатны майстар перакладу. Газ. «Літаратура і мастацтва». 1957, 29 мая.

У артыкуле разгледжаны пераклады М. Багдановіча вершаў Гейнэ, Верхарна і Верлена, а таксама наследаванні народным песням розных народаў.

128. **Фактаровіч Д., Цімафеева В. і Лапідус Н**. Беларуская літаратура за мяжой. Мінск, 1958, 43 с. (Т-ва па распаўсюджванню палітычных і навуков. ведаў Беларус. ССР). 8.400 экз. 65 к.

На с. 13—16 характарызуецца перакладчыцкая дзейнасць М. Багдановіча, падкрэсліваецца значэнне паэта як папулярызатара лепшых узораў замежнай літаратуры і асабліва творчасці славянскіх народаў.

129. **Лапидус Н.** Максим Богданович — критик и переводчик зарубежных литератур. «Ученые записки (Белорус. гос. ун-та)», вып. 39, серия филологич., 1957, с. 97—120.

Подробный анализ статей и рецензий Богдановича, содержащих оценку иностранной литературы, и поэтические переводы его с латинского языка (Гораций и Овидий), с французского (Арвер, Верлен), с бельгийского (Верхарн), с немецкого (Шиллер и Гейнэ), с финского (Рунеберг) и др.

Переводы Максима Богдановича сравниваются с переводами, выполненными другими авторами.

130. **Лапідус Н.** Максім Багдановіч-перакладчык. Часоп. «Полымя», 1959, № 7, стар. 130—138.

Анализуючы паэтычныя і празаічныя пераклады М. Багдановіча з рускай, украінскай і замежных літаратур, аўтар артыкула дае наступную характарыстыку перакладчыцкай дзейнасці паэта:

Выбар твораў для перакладу ў беларускага паэта быў абумоўлен яго грамадска-палітычнымі і эстэтычнымі поглядамі — падпарадкаваўся задачам барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне беларускага народа.

Захоўваючы традыцыі Пушкіна, М. Багдановіч асуджаў метад літаральнага перакладу, патрабаваў перадаваць сродкамі і прыёмамі, уласцівымі роднай мове, змест і нацыянальную асаблівасць арыгінала.

### 6. Максім Багдановіч-крытык

131. **Колас Я.** Выдатны паэт і крытык. (Да 30-годдзя з дня смерці Максіма Багдановіча). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1947, 24 мая.

У кн.: Колас Я. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, 1957, с. 241—242.

Анатацыю гл. пад № 96. Гл. таксама артыкул Я. Коласа «Шаўчэнка і беларуская паэзія» (У кн.: *Колас Я.* Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1957, с. 174—188.

132. **Івашын В.** Максім Багдановіч аб укра-

інскай літаратуры. Часоп. «Полымя», 1954, № 4, с. 118—124.

Дэтальны аналіз літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў М. Багдановіча, прысвечаных украінскай літаратуры. Аўтар разглядае М. Багдановіча як аднаго з заснавальнікаў дэмакратычнай беларускай крытыкі.

133. **Охрименко П.** Максим Богданович и украинская литература. «Ученые записки (Гомельского педагогического ин-та им. В. П. Чкалова»), 1954, вып. I, с. 91—109.

О литературно-критических статьях М. Богдановича, посвященных украинской литературе см. на с. 91—98.

134. **Лапидус Н.** М. Богданович и Т. Шевченко. «Ученые записки (Белорус. гос. университета)», вып. XXVII, серия филологическа. Минск, 1956, с. 200—212.

Анализ литературно-критических статей М. Богдановича, посвященных творчеству Т. Шевченко см. на с. 200—203.

135. **Акулич А.** О мировоззрении М. А. Богдановича. «Ученые записки (Минского гос. педагогического ин-та им. А. М. Горького)». Вып. 6, юбилейный. Минск, 1956 (1957). с. 121—132.

Аннотацию см. под № 90.

136. **Лапидус Н.** Максим Богданович — критик и переводчик зарубежных литератур «Ученые записки (Белорус. гос. ун-та)», вып. 39, серия филологич. 1957, с. 97—120.

Аннотацию см. под № 129.

137. **Ватацы Н.** і **Лапідус Н.** Максім Багдановіч аб чэшскім народзе, газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 15 чэрв.

Анатацыю гл. № 126.

138. **Ахрыменка П.** Фальклорна-літаратурныя сувязі ўкраінскага і беларускага народаў. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1959, 204 с. 4000 экз. 6 р. 30 к.

Аб крытычных работах М. Багдановіча, прысвечаных разгляду украінскай літаратуры, гл. на стар. 153—158.

## 7. Звесткі аб рукапісах і публікацыі літаратурнай спадчыны М. Багдановіча

140. **Бываеўскі Н.** Знойдзеныя скарбы (рукапісаў М. Багдановіча). Газ. «Савецкая Беларусь», 1923, № 87.

141. **Бываеўскі Н.** Скарбы творчасці Максіма Багдановіча. (Атрыманыя рукапісы пісьменніка). Газ. «Савецкая Беларусь», 1923, № 134.

У сваіх артыкулах Н. Бываеўскі паведамляе чытачам аб тым, што Інстытут беларускай культуры атрымаў ад бацькі паэта Адама Ягоравіча і з некаторых іншых прыватных архіваў рукапісы твораў паэта часткаю ў чарнавых накідах, часткаю закончаных і падрыхтаваных да друку, а таксама цікавыя матэрыялы да яго біяграфіі.

142. **Мачульскі В.** Вопіс рукапісаў М. Багдановіча і матэрыялаў да яго біяграфіі. У кн.: М. Багдановіч. Творы. Т. 2, Мінск, Інбелькульт. 1928, с. 385—400.

143. **Вольскі В.** Невядомыя рускія тэксты Максіма Багдановіча. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1949, 10 верасня.

У артыкуле паведамляецца аб тым, што ў Мінску, сярод кніг, захопленых нямецкімі фашыстамі і прывезеных пасля вайны з Германіі, былі знойдзены два аўтографы М. Багдановіча.

Адзін з іх з'яўляецца спісам твораў паэта — вершаў, апавяданняў і крытычных артыкулаў, напісаных на рускай мове і надрукаваных у розных рускіх перыядычных выданнях 1912—1914 гг. Другі аўтограф з'яўляецца запісам розных афарызмаў.

У спісе твораў значацца рускія варыянты вершаў «О, как уютно, чисто, мило...», «Городская любовь» и «В горячем споре», апублікаваныя ў часопісе «Сатирикон», 1912, №№ 30, 46, 49, невядомыя да таго часу, і якія не ўвайшлі ў акадэмічны збор твораў М. Багдановіча, выдадзены ў 1927 г. Вершы гэтыя не былі падпісаны поўным імем паэта і таму засталіся не заўважанымі. У артыкуле даецца поўны іх тэкст.

144. **Барсток М.** Новыя матэрыялы М. Багдановіча. Часоп. «Беларусь», 1953, № 6, с. 21—22.

У артыкуле ўпершыню друкуецца вытрымка з новых успамінаў А. Д. Цітова аб М. Багдановічу, у якім прыводзіцца тэкст невядомага раней верша — экспромта М. Багдановіча, напісанага на рускай мове, «Николай Иванович! Вы ли?»

М. Барсток разглядае некалькі артыкулаў і рэцэнзій М. Багдановіча, якія засталіся па-за ўвагай крытыкі і не ўвайшлі ў «Творы» паэта (т. I, 1927; т. 2, 1928). Гэта артыкул «Львов» і рэцэнзіі М. Багдановіча на кнігі Н. М. Нікольскага «Древний Вавилон», Тэафілія Гацье «Эмали и Камеи», зборнік «Отчизна», Т. I і пуцевадзіцель «Крым».

У часопісе змешчаны таксама наступныя здымкі: 1. Дом, дзе жыў у 1914—1915 гг. М. Багдановіч (Яраслаўль, вул. Чайкоўскага, дом 28); 2. Будынак былога юрыдычнага ліцэя ў Яраслаўлі, дзе вучыўся М. Багдановіч.

145. **Александровіч С.** Творчая спадчына паэта. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1956, 8 снежня.

Асноўныя думкі артыкула: не ўсё зроблена ў справе збору матэрыялаў аб жыцці М. Багдановіча і публікацыі невядомых яго твораў.

Крытыка і літаратуразнаўства недаравальна мала займаюцца вывучэннем творчасці паэта. За пасляваен-

ны час абаронена некалькі дысертацый пра творчасць М. Багдановіча. Але чытач нічога не ведае аб тым, што новага ўнеслі гэтыя працы ў вывучэнне спадчыны паэта.

Беларускія жывапісцы і скульптары дагэтуль не прысвяцілі яму значных твораў.

Не ўсё зроблена і ў справе ўвекавечання памяці паэта.

146. **Ватацы Н. і Лапідус Н.** Невядомыя творы Максіма Багдановіча. (Уступ. артыкул і публікацыя). Часоп. «Полымя», 1957, № 5, с. 155—162.

Публікацыя некалькіх вершаў і артыкулаў М. Багдановіча, якія не ўвайшлі ў зборы твораў і зборнікі выбраных твораў, выдадзеныя да 1957 года, змяшчае наступныя матэрыялы:

1) вершы «Не бядуй, што хмары...» «Маці-Беларусь! Цяжка твайму сыну...», «Жывая лялечка», «Не душу і не сэрца...», «Вечар ціхі, вечар просты...», «Крытыку» (1910) і верш Я. Купалы «Для зямлі маіх прадзедаў», перакладзены Максімам Багдановічам на рускую мову;

2) артыкулы М. Багдановіча «Иван Франко» і «Новая интеллигенция», а таксама ўрыўкі з артыкулаў «Вобразнасць апісанняў у вершах В. Марцінкевіча», «Частушка» і «Черновой незаконченный набросок»;

3) уступны артыкул да публікацыі.

Пералічаныя вершы ўключаны пазней у кнігу М. Багдановіча «Творы» (1957), выдадзеную Акадэміяй навук БССР.[1]

147. **Бэндэ Л.** З неапублікаванага (уступ. артыкул і публікацыя). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая.

Публікуемы тут верш «Не бядуй, што хмары...», і ўрыўкі з вершаў «Маці-Беларусь! Цяжка твайму сыну...», «Я адну сабе радачку даў...» (радкі з верша «Як Базыль у паходзе канаў», з чарнавога аўтографа), а таксама ўрывак з артыкула «Частушка», былі не-

---

[1]) Паказаныя тут артыкулы ў кнігах аўтара не друкаваліся.

калькі раней ужо апублікаваны ў часопісе «Полымя», 1957, № 5, с. 156—158.

148. **В Минск доставлены библиотека и архив семьи Богдановичей.** Газ. «Советская Белоруссия», 1957, 28 мая.

У гэтым паведамленні гаворыцца аб найбольш цікавых матэрыялах, якія змяшчае архіў.

149. **Ефімаў С.** Каштоўны набытак. Часоп. «Маладосць», 1957, № 8, с. 144.

У артыкуле паведамляецца аб тым, што бібліятэка Акадэміі навук БССР сумесна з Інстытутам літаратуры набыла кнігі і рукапісныя матэрыялы Адама Ягоравіча Багдановіча — бацькі Максіма Багдановіча; кнігі з яго бібліятэкі; лісты і нататкі Марыі Апанасаўны Багдановіч — маці паэта; рэдкія фатаграфіі бацькоў Максіма Багдановіча, яго самога, яго братоў. Сярод матэрыялаў Адама Ягоравіча — рукапіс «Успаміны аб сыне — Максіме Багдановічу».

150. **Смолкін М.** З рукапіснай спадчыны М. Багдановіча. (Уступ. артыкул і публікацыя). Часоп. «Полымя», 1958, № 3, с. 175 — 182.

Публікацыя з рукапісаў архіва рэдакцыі газеты «Наша ніва», частка якога захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Акадэміі навук Літоўскай ССР (Вільнюс) у фондзе VE — 39.

Апублікаваны пісьмы Максіма Багдановіча 1911—1914 гадоў да работнікаў рэдакцый альманаха «Маладая Беларусь» і газеты «Наша Ніва»; урывак з невядомага крытычнага артыкула, у якім даецца ацэнка мастацкіх твораў, змешчаных у клерыкальнай газеце «Bielarus» (Вільна, 1913—1915); тэкст перакладу верша П. Верлена «Ракаўкі» на беларускую мову.

151. **Ватацы Н.** Невядомы тэкст Максіма Багдановіча. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1958. 7 чэрвеня.

Публікацыя беларускага арыгінала верша М. Багдановіча «Белым кветам адзета каліна...», які не ўвай-

шоў у зборы твораў паэта і быў вядомы толькі ў аўтарскім перакладзе яго на рускую мову.

152. **Гурэвіч Э. і Фралова Н.** Архіў А. Я. Багдановіча. Газ. «Літаратура і мастацтва», 1958, 7 мая.

Аўтары артыкула звяртаюць увагу чытача на тое, што адсутнасць аўтографаў Максіма Багдановіча (рукапісны архіў паэта, перададзены ў 1923 г. яго бацькам Інстытуту беларускай культуры, загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны) і ўспамінаў яго сучаснікаў, вельмі востра адчуваюцца пры вывучэнні творчасці паэта і пры падрыхтоўцы выданняў яго твораў. Таму набыты Інстытутам літаратуры АН БССР архіў Адама Ягоравіча Багдановіча, бацькі паэта, мае вялікае практычнае значэнне.

Асаблівую цікавасць пры вывучэнні спадчыны паэта маюць, па думцы аўтараў артыкула, наступныя матэрыялы: «Матэрыялы да біяграфіі М. Багдановіча», напісаныя Адамам Ягоравічам (раней яны былі часткова выкарыстаны ў крытыка-біяграфічным нарысе І. Замоціна, змешчаны у 2-м томе «Твораў» паэта); перапіска паміж бацькамі паэта, якая адносіцца да 1891—1895 гг.; перапіска А. Я. Багдановіча з Інбелкультам і Дзяржаўным выдавецтвам БССР у сувязі з выданнем твораў сына.

У перапісцы з Інбелкультам і з выдавецтвам сустракаюцца заўвагі тэксталагічнага парадку, што вельмі важна ўлічыць пры складанні будучых выданняў твораў паэта.

## МАКСІМ БАГДАНОВІЧ У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

153. **Александровіч А.** — На магілу Максіма Багдановіча. (Верш, дата напісання: 19 жніўня 1924 г.). У кн.: А. Александровіч. — Па беларускім бруку. Мінск, ДВБ, 1925, с. 43—46; Выбранае. Мінск, 1958, с. 14—15.

154. **Аўрамчык М.** — На магіле Максіма Багдановіча. (Верш): У кн.: Аўрамчык, М. Ключы жураўліныя. Мінск, Дзяржвыд. БССР, 1960, с. 51—52.

155. **Броўка П.** — М. Багдановіч. (Верш 1927 г.). Газ. «Чырвоная Полаччына», 1927, № 42. У кн.: Росквіт. Літ.-маст. альманах полацкага філіяла ўсебел. аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк», Полацк, 1927, с. 11.

156. **Броўка П.** — Беларусь. (Паэма). У кн.: П. Броўка. — Выбраныя творы. Мінск. ДВБ, 1951. с, 351—366. Гл. с. 360.

157. **Бурьян Б.** У синей бухты. (Повесть). Жур. «Советская Отчизна», 1958, № 1, с. 71—106; в кн: У синей бухты. Госиздат БССР, Минск. 1959.

158. **Ясакар. (Зм. Бядуля).** — М. Багдановічу. (Верш 1918). Газ. «Вольная Беларусь» Мінск). 1918, № 19.

159. **Бядуля Зм.** — Страцім-Лебедзь. (З апавяданняў аб М. Багдановічу). Газ. «Літаратура і мастацтва». 1941, 5 сакав.

160. **Бядуля Зм.** — Стратим-Лебедь (Из рассказов о М. Богдановиче. Перев. с белорусского). В кн.: Зм. Бядуля. — Избранное. Перев. с белорусского. М., Гослитиздат, 1953, с. 608—614.

161. **Васілёк М.** — Памяці М. Багдановіча. (Верш). Газ. «Наша праўда» (Вільна), 1927. № 16.

162. **Вольны А.** — Максіму Багдановічу. (Верш 1927). Газ. «Савецкая Беларусь». 1927, 29 мая.

163. **Гарбуноў Д.** — Максіму Багдановічу. (Верш). Пер. **М. Хведаровіч.** Газ. «Літаратура і мастацтва». 1958, 4 чэрвеня.

164. **Глебка П.** — Памяці М. Багдановіча.

(Верш 1927). Часоп. «Узвышша», 1927, № 2, с. 101.

165. **Глебка П.** — М. Багдановічу. (Верш 1927). У кн.: П. Глебка — Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1952, с. 37—38; Збор твораў. Т. I. Мінск, 1958, с. 63—64.

166. **Дубоўка У.** — Нават мора змяніла свой колер. (На могілцы Максіма Багдановіча). Верш. У кн.: **У. Дубоўка.** Выбраныя творы. Мінск, 1959, с. 39—40.

167. **Дудар П.** — Максіму Багдановічу. (Верш). Газ. «Савецкая Беларусь», 1927, № 116.

168. **Журба Я.**—Песняру хараства. (Памяці М. Багдановіча ў 5-ю гадавіну яго смерці 25 мая 1917). Верш. 1924. У кн.: Журба Я. — Заранкі. Мінск, 1924, с. 84.

169. **Жылка Ул.** — Максім Багдановіч. (Санет). Часоп. «Узвышша», 1927, № 3, с. 77.

170. **Клімковіч М.** — На магіле Максіма Багдановіча. (Верш. 1947). Часоп. «Беларусь», 1956, № 12, с. 24.

171. **Коршак А.** — Б'ецца мора... (Верш 1940). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая.

172. **Лебедзь М.** — Пясняр хараства. Максіму Багдановічу. (Верш). Часоп. «Полымя», 1925, № 7, с. 67.

173. **Лось Е.** — На ялцінскіх могілках. (Верш). Часоп. «Маладосць», 1957, № 5, с. 20.

174. **Лявонны Ю.** — Максіму Багдановічу. (Верш). Газ. «Магілёўскі селянін», 1927, № 36.

175. **Матэвушаў В.** — Памяці Максіма Багдановіча. (Верш). Газ. «Магілёўская праў-

да», 1957, 25 мая. У кн.: Матэвушаў В. Зорны шлях. Мінск, ДВБ, 1959, с. 10.

176. **Садовский Е.** — Жизнь поэта. (Главы из повести «Максим Богданович»). Альманах «Отчизна», вып. 2. Минск, 1946, с. 4—35.

177. **Мікуліч Б.** — Развітанне. (Аповесць з жыцця Максіма Багдановіча). У кн.: **Мікуліч Б.** Выбранае. Мінск, ДВБ, 1959. с. 323—350.

178. **Пестрак П.** — На магіле Максіма Багдановіча. (Верш). Часоп. «Полымя», 1960, № 6, с. 77—78.

179. **Садоўскі Е.** — Маладосць паэта. (Урывак з аповесці «Максім Багдановіч»). Газ. «Літаратура і мастацтва», 1941, 1 студз.

180. **Садоўскі Е.** — Пясняр. (Аповесць з жыцця беларускага паэта Максіма Багдановіча). Часоп. «Полымя, 1945, № 7—8, с. 72—103.

181. **Танк М.** — Над магілай М. Багдановіча. (Верш). У кн.: М. Танк. — Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1953, с. 172—173.
Выбраныя творы. Мінск, Вучпедвыд БССР, 1954, с. 14.

182. **Трус П.** — Памяці Максіма Багдановіча. (Верш). У кн.: П. Трус. — Выбраныя творы. Мінск, ДВБ, 1953, с. 172—173.

183. **Хвойка Р.** — М. Багдановічу. (Верш).
У кн.: Росквіт. Літ.-маст. альманах Полацкага філіяла ўсебел. аб'яднання паэтаў і пісьменнікаў «Маладняк». 1927, с. 131; Газ. «Чырвоная Полаччына», 1927, № 42.

## ІЛЮСТРАЦЫІ, ЗВЯЗАНЫЯ З ЖЫЦЦЁМ І ТВОРЧАСЦЮ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**Максім Багдановіч.** З фатаграфічнай карткі 1909 года. На картцы — аўтограф верша «Я бальны, бяскрыдлаты паэт».

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 1, 1927, с. 9; Творы, 1957, с. 173; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Мінск, 1958, с. 81; **Александровіч С.** Незабыўнымі сцежкамі. Мінск, 1959, с. 81.

**Максім Багдановіч.** З фатаграфічнай карткі 1911 года. На картцы аўтограф верша «Я вспоминаю дом старинный...».

У кн.: **Багдановіч М.** Творы. т. 1, 1927, с. 185.

**Максім Багдановіч.** З фатаграфічнаі групы 1915 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. I, 1927, с. IV; Выбраныя творы, 1940, с. 3; Выбраныя творы, 1952, с. I; Творы, 1957, с. 2; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч, Мінск, 1958, с. 113. У часоп. «Беларусь», 1957, № 5, с. 14.

**Максім Багдановіч.** З партрэта работы *В. Волкава.*

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. I; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Мінск, 1958, с. 1.

**Максим Богданович.** Портрет работы худож. *Ю. Ростовцева.*

В кн.: **Богданович М.** Избранные произведения. М., 1953, с. 1.

**А. Я. Багдановіч, бацька пісьменніка.** З фатаграфічнай карткі 1887 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. LII; Творы, 1957, с. 75; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Мінск, 1958, с. 17.

**М. А. Багдановіч, маці пісьменніка.** З фатаграфічнай карткі 1893 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. LXXXVII; Творы, 1957, с. 107; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Мінск, 1958, с. 33.

**Максім Багдановіч з роднай цёткай і братамі** (сядзіць з левага боку). З фатаграфічнай карткі прыблізна 1897 года.

У кн.: **Багдановіч М.,** Творы, т. 2, 1928, с. XX; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч, Мінск, 1958, с. 49.

**Максім Багдановіч сярод таварышаў-студэнтаў** (за сталом сёмы справа). З фатаграфічнай групы 1914 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 1, 1927, с. 273; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч, Мінск, 1958, с. 97.

**Максім Багдановіч сярод супрацоўнікаў рэдакцыі газеты «Голос».** З фатаграфічнай карткі 1915 года.

У кн.: **Багдановіч М.,** Творы, т. 2, 1928, с. 217; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч, 1958, с. 145.

**Дом і пакой у Мінску, дзе ў 1891 годзе нарадзіўся Максім Багдановіч** (сярэднія два вокны на другім паверсе). З фатаграфічнага здымку 1928 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, Мінск, 1928, с. 119; Творы, 1957, с. 43; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч, 1958, с. 65.

**Дом па вуліцы імя М. Горкага ў Мінску, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч.** Рэканструяваны пасля Айчыннай вайны, з фотаздымка 1957 года.

У газ. «Літаратура і мастацтва», 1957, 25 мая.

**Дом в Нижнем Новгороде (г. Горький, Грузинская ул. д. 32, сохранился до настоящего времени), в котором с 1896 года в течение 2 с лишним лет жила семья Богдановичей.** Здесь часто бывал А. М. Горький.

В газ. «Горьковская правда», 1960, № 13; «Советская Белоруссия», 1960, 8 апр.

**Дом № 29[1] (дом Ржэўскіх) па вуліцы Чайкоўскага (былая Любімская) у гор. Яраслаўлі, дзе ў 1914—1915 г.г. жыў М. Багдановіч.**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы. Мінск, 1957, с. 139; **Александровіч С.** Незабыўнымі сцежкамі, Мінск, 1959, с. 54. У часоп. «Беларусь», 1953, № 6, с. 21.

**Будынак Яраслаўскай мужчынскай гімназіі, у якой у 1908—1911 г.г. вучыўся Максім Багдановіч.**

У газ. «Мінская праўда», 1957, 25 мая.

**Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй, у якім вучыўся М. Багдановіч (1911—1916).**

У часоп. «Беларусь», 1953, № 6, с. 21; у кн.: **Багдановіч М.** Творы, 1957, с. 207; **Александровіч С.** Незабыўнымі сцежкамі. Мінск, 1959, с. 56.

**Магіла Максіма Багдановіча ў Ялце.** З фатаграфічнай карткі 1924 года.

---

[1] У публікацыі М. Барсток (часоп. «Беларусь», 1953, № 6, с. 21) — дом № 28.

У кн.: **Багдановіч М.**, Творы, т. 1, 1927, с. 428.

**Помнік Максіму Багдановічу,** устаноўлены на тэрыторыі санаторыя «Беларусь», на беразе Чорнага мора, у 15 кіламетрах ад Ялты.

У газ. «Советская Белоруссия», 1957, 28 мая; «Літаратура і мастацтва», 1957, 8 мая; «Курортная газета» (Ялта), 1957, 28 мая; «Радзянський Крим» (Сімферопаль) 1957, 28 травня.

**Групавы фотаздымак адказнага сакратара** Яраслаўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Паўла Фёдаравіча Лосева, братоў Максіма Багдановіча—Паўла Адамавіча і Міколы Адамавіча і паэта Дзмітрыя Гарбунова, якія сабраліся разам у дзень устанаўлення Яраслаўскім гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных мемарыяльнай дошкі на будынку Тэхналагічнага інстытута, дзе да рэвалюцыі размяшчалася мужчынская гімназія, у якой вучыўся Максім Багдановіч.

У часоп. «Беларусь», 1958, № 9, с. 23.

**Аўтограф 1908 г. верша «На чужыне».**

У кн.: Творы, т. 1, 1927, с. 5; Творы, 1958, с. 153.

**Аўтограф 1910 г. верша — «Я бальны, бяскрыдлаты паэт...».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, 1957, с. 158.

**«Апусціўшы густыя расніцы»** і інш. накіды. З чарнавых аўтографаў 1912 года.

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. I, 1927, с. 327.

**Аўтограф 1915—1916 гг. верша «Маладыя гады».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. I, 1927, с. 99; Творы,

1957, с. 255; **Майхровіч С.** Максім Багдановіч. Мінск, 1958, с. 128.

**Чарнавы аўтограф 1912 г. (прыблізна) верша П. Верлена «Ціхі і сіні» ў перакладзе Максіма Багдановіча.**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. I, 1927, с. 257; Творы, 1957, с. 333.

**Аўтограф перакладу верша Я. Купалы «Жніво».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, 1957, с. 371.

**Аўтограф артыкула «Санет».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. 253.

**Аўтограф артыкула «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI стагоддзя».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. 21.

**Аўтограф артыкула «Забутий шлях».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. 62.

**Аўтограф артыкула «Украинское казачество».**

У кн.: **Багдановіч М.** Творы, т. 2, 1928, с. 176.

## ВЫДАННІ, У ЯКІХ ДРУКАВАЛІСЯ ТВОРЫ М. БАГДАНОВІЧА ПРЫ ЖЫЦЦІ АЎТАРА

### а) Беларускія выданні.

1. **Наша ніва.** Першая беларуская газета з рысункамі. Выходзіць раз у тыдзень рускімі і польскімі літарамі. Вільна, 1906—1915.

1907, № 24 (Апавяданне «Музыка», першы друкаваны твор М. Багдановіча).

1909, №№ 1, 10, 35, 36, 37, 38, 39, 41, 42, 43, 44
46, 47, 50, 51—52.

1910, №№ 2, 3, 6, 8, 10, 11, 21, 23—24, 28, 30,
31, 33, 35, 37, 39, 41, 42, 44—45, 47 51.

1911, №№ 1, 2, 3, 4, 5, 7, 11, 13, 14, 16—17, 18—19,
25, 26, 28—29, 33, 36, 39, 40, 44, 46, 49, 51—52.

1912, №№ 4, 10, 12—13, 23, 26, 30.

1913, №№ 9, 12, 20, 22, 26—27, 28, 30, 39, 44, 47,

1914, №№ 4, 7, 17, 21—22, 26.

1915, №№ 2, 3, 7, 18, 28, 29—30, 31.

2. **Першы беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1910 г.** Вільна, выд. «Нашай нівы» № 13, 1910, с. 59.

3. **Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1911 г.** Год. выд. 2-гі. Вільна, 1911, с. 78—79.

4. **Беларускі каляндар «Нашай нівы» на 1913 г.** Год. выд. 4-ы. Вільна, 1913, с. 91.

5. **Калядная пісанка. 1913 год.** Вільна, друк. М. Кухты. 1913, с. 27—30.

## б) Рускія выданні.

6. **Вестник Европы.** Журнал науки — политики — литературы. СПБ, 1911, № 1 (январь), с. 333.

7. **Голос.** Ежедневная газета. Ярославль 1909—1917 гг.

1913, №№ 99—100, 284, 295.

1914, №№ 3, 8, 14, 22, 29, 32, 35, 46, 50, 62, 79, 129,
141, 153, 194, 228, 264.

1915, №№ 138, 139.

1916, №№ 12, 24, 65, 76, 83, 115, 121, 129, 132, 134,
137, 138, 139, 149, 154, 179, 188, 200.

Па сведчанню былога рэдактара газеты «Голос» С. С. Каныгіна, які пражывае ў гор. Яраслаўлі, М. Багдановіч пісаў і друкаваў у газеце шмат вершаў, апавяданняў пад рознымі псеўданімамі. У сучасны момант навуковымі работнікамі Акадэміі навук БССР, у супрацоўніцтве з С. С. Каныгіным, была праведзена да-

следаванне старонак газеты, з мэтаю выяўлення ўсіх тэкстаў М. Багдановіча. Выяўленыя тэксты не публікаваліся.

8. **Ежемесячный журнал литературы, науки и общественной жизни.** Петербург — Петроград, 1914—1916.

1914, № 3.
1916, № 6, с. 233—246.

9. **Жизнь для всех.** Ежемесячный иллюстрированный журнал. Петербург — Петроград, 1910—1916.

1914, № 5—6, с. 796—803;
1916, № 7, с. 790.

10. **Музыка.** Еженедельник. Москва, 1910—1916 г. 1915, № 21, стр. 127—129.

11. **«Национальные проблемы».** Выходит два раза в месяц. Москва. 1915.

1915, № 2, с. 17—19.

12. **Нижегородский листок.** Ежедневная газета. Нижний Новгород, 1895—1916.

1915, №№ 94, 98, 188.

13. **Пушкин и его современники.** Материалы и исследования, вып. XXVIII. Петроград, изд. Отделения русского языка и словесности Академии Наук, 1917, с. 108—110.

14. **Русский экскурсант.** Выходит 10 раз в год. Ярославль, 1914—1916 г.

1914, № 5—6, с. 58—60.
1915, №№ 1, 18—24,53; 2. 96—104.
1916, №№ 1, с. 11—14; 2. с. 14—17; 3. с. 8—12.

15. **«Сатирикон».** Еженедельный юмористический журнал. Петербург, 1907—1914.

1912, №№ 30, 46, 49.

16. **Северная газета.** Выходит ежедневно. Ярославль, 1913—1915.

1913, №№ 36, 42.
1914, № 1.

17. Ж. **«Северные записки».** Ежемесячный журнал. Петербург, 1913—1916.

1915, № 2, с. 239.

18. **Украинская жизнь.** Ежемесячный журнал. Москва, 1912—1916.

1914, № 2, 39—48, 11—12, с. 79—81.
1915, №№ 1, с. 50—64; 2. с. 53—61.
1916, №№ 2, 7, 8, 11, 12, 46—59, 80—85.
1917, № 1—2,с. 104—106.

### в) **Украінскія выданні.**

19. **Святицький, Іларіон.** Відродженнэ білоруського пісьменства. Львів, 1908, с. 9.

20. **«Літературно-науковий вістник».** Київ, 1909, № 9, с. 511.

21. **Рада.** Газета. Київ, 1909.

## ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК[1]


**А**

Абеліовіч Л. — 38, 44, 49, 52, 63
Авідзій — 1, 9, 129
Агурцоў — 81
Акуліч А. — 90, 135
Аладаў М. — 33, 55, 64, 67
Александровіч А. — 154
Александровіч С. — 20, 80, 85, 146
Аўрамчык М. — 154-а
Ахрыменка П. — 7, 118, 119, 124, 133, 138, 139

**Б.**

Багатыроў А. — 39, 41, 46, 47, 48, 51, 57, 61
Багдановіч Адам Ягоравіч — 68, 69, 70, 71, 72, 140—141, 153
Багдановіч, Максім — 1—67; аб ім — 68—183.
Багдановіч Марыя Апанасаўна — 149
Багдановіч Мікола Адамавіч — 184
Багдановіч Павел Адамавіч — 84, 85
Барсток М. — 89, 92, 103, 144
Барысенка В. — 8, 101
Белазёраў А. — 69
Бешкін Г. — 69
Бойка П. — 71
Броўка П. — 101, 155, 156
Бур'ян Б. — 157
Бываеўскі Н. — 140, 141
Бэндэ Л. — 86, 148
Бядуля Зм. — 76, 158, 160

**В.**

Варановіч С. — 123
Васілёк М. — 161
Ватацы Н. — 19, 81, 126, 137, 147, 152
Верлен П. — 127, 128, 129, 136, 151
Верхарн Э. — 127, 128, 129, 136
Волкаў А. — 13, 14
Вольны А. — 162
Вольскі В. — 143

**Г.**

Гальперын В. — 83
Гарбацэвіч В. — 78
Гарбуноў Д. — 84, 163
Гейнэ Г. — 127, 128, 129, 136
Глебаў — 87
Глебка П. — 88, 164, 165
Горкі М. — 68, 69, 70, 71, 90, 115
Грынчык М. — 83, 93, 95, 106, 108, 109
Гурэвіч Э. — 153

**Д.**

Дзябольскі Д. — 77


[1] У алфавітны паказальнік уключаны прозвішчы аўтараў крытычных артыкулаў і мастацкіх твораў, прысвечаных М. Багдановічу, рэдактараў і перакладчыкаў, кампазітараў, напісаўшых музыкальныя творы на словы М. Багдановіча. Лічбы адсылаюць да адпаведнага нумара бібліяграфічнага запісу ў даведніку.

Драй-Хмара М. — 17
Дубоўка Ул. — 166
Дудар А. — 167

**Е.**

Елісеяў А. — 70

**Ж.**

Жалезняк Р. — 23, 28, 29, 30
Журба Я. — 168
Жылка Ул. — 169

**З.**

Замоцін І. — 7, 74
Збіневіч Я. — 69

**І.**

Іваноў М. — 86
Івашын В. — 8, 78-а, 78-б, 114, 116, 120, 132
Ірынін Б. — 15
Ісакоўскі М. — 15

**К.**

Казека Я. — 86
Карпачоў М. — 86
Карскі Е. — 73
Клімковіч М. — 100, 111, 170
Колас Я. — 96, 117, 131
Корман Б. — 99
Коршак А. — 171
Крымскі А. — 8
Крышталь В. — 7
Купала Я. — 7, 8, 99, 116

**Л.**

Лапідус Н. — 7, 81, 82, 110, 115, 122, 126, 128, 130, 134, 136, 137, 147
Ларчанка М. — 9, 86, 88, 94, 112
Лебедь М. — 172
Лосеў П. — 84
Лось Е. — 173
Лынькоў М. — 8, 101
Лявонны Ю. — 174

**М.**

Мазалькоў Я. — 15, 16, 98
Майхровіч С. — 10, 11, 83, 85, 88, 93, 95, 108, 127
Макарэвіч А. — 83, 93, 95, 108
Матэвушаў В. — 175
Мачульскі В. — 142
Машынскі С. — 121
Мікуліч Б. — 177
Міхалап Я. — 86

**Н.**

Нікольскі Н. — 144
Някрасаў К. — 2, 3, 4

**О.**

Олесь О. — 7, 31, 129

**П.**

Перкін Н. — 8, 87, 88, 91, 101, 102, 128
Пестрак П. — 178
Пушкін А. — 110, 113, 130
Пшыркоў Ю. — 8
Пятровіч Н. — 86

**Р.**

Рунеберг — 127, 128, 129, 136

**С.**

Сахановіч Д. — 104
Сагараў Л. — 105
Садоўскі Я. — 79, 176, 179, 180
Самійленко В. — 87, 132, 133, 138
Свабодаў А .— 69
Свяцкі М. — 12
Семынін П. — 15
Смолкін М. — 113, 151
Срэдзін Л. — 68

**Т.**

Тагор Рабіндранат — 87
Танк М. — 181
Трус П. — 182
Туранкоў А. — 31, 32, 36, 40, 42, 43, 45, 50, 54, 56, 58—60, 62, 65, 66.
Тырманд Э. — 34, 35, 37

**У.**

Усікаў Я. — 85

**Ф.**

Фактаровіч Д. — 128
Фролава Н. — 153
Франко І. — 119, 121, 131, 132, 133, 138

**Х.**

Хведаровіч М. — 163
Хвойка Р. — 183

**Ц.**

Цімафеева В. — 128
Цітоў А. — 85, 144
Цыганоў М. — 75

**Ч.**

Чарнецкі М. — 84
Чорны К. — 97
Чэхаў А. — 68

**Ш.**

Шаўчэнка Т. — 117, 118, 119, 122—124, 131, 132, 133, 134
Шылер Ф. — 127, 129, 136, 138.

**Я.**

Ярош М. — 85
Ясакар, гл. Бядуля Зм.
Яфімаў С. — 150

# З М Е С Т


Стр.

Прадмова . . . . . . . . . . . . . . 5

Максім Багдановіч. (Бібліяграфічная даведка) 8

Кнігі М. Багдановіча: 19

1. Прыжыццёвыя выданні . . . . . . 19
2. Пасмяротныя выданні . . . . . . 21
3. Кнігі, выдадзеныя для дзяцей . . . . 23
4. Кнігі, перакладзеныя на рускую і украінскую мовы . . . . . . . 24

Творы М. Багдановіча, якія не ўвайшлі ў выданні збораў яго твораў: 25

а) мастацкія творы . . . . . . . 25

б) артыкулы . . . . . . . . . 28

Творы М. Багдановіча, пакладзеныя на музыку 34

Літаратура аб жыцці і творчасці М. Багдановіча: 34

1. Матэрыялы да біяграфіі . . . . . 40
2. Эстэтычныя погляды М. Багдановіча 43
3. Літаратурная дзейнасць М. Багдановіча 48
4. М. Багдановіч і фальклор . . . .
5. Творчыя сувязі М. Багдановіча з рускай, украінскай і замежнай літаратурамі. Максім Багдановіч як перакладчык 50
6. Максім Багдановіч-крытык . . . . 56
7. Звесткі аб рукапісах і публікацыі літаратурнай спадчыны М. Багдановіча . 58

Максім Багдановіч у мастацкай літаратуры . 62

Ілюстрацыі, звязаныя з жыццём і творчасцю М. Багдановіча . . . . . . . 66

Выданні, у якіх друкаваліся творы М. Багдановіча пры жыцці аўтара . . . . 70

Імянны паказальнік . . . . . . . . 74

Выдавецтва газеты «Мінская праўда».

Падпісана да друку 13/IX-61 г. Фарм. пап. $70 \times 92^1/_{32}$.
Друк. арк. 2,375. Папяр. арк. 1,287. Уч.-выд. арк. 2,13.
Зак. 692. Цана 10 кап. Тыр. 2.000.

Мінская аблдрукарня «Перамога», г. Маладзечна.

Цана 10 кап.